ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА ДЛЯ СУАЙЧЫННІКАЎ ЗА МЕЖАМІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Голас Радзімы

№ 48 (2450) 30 лістапада 1995 г. Выдаецца з 1955 г. Цана 800 рублёў.



ТЭАТР МЯНЯЕЦЦА РАЗАМ З ЭПОХАЙ

Старэйшы і самы вядомы тэатральны калектыў Беларусі -- Нацыянальны акадэмічны тэатр Янкі Купалы -- адсвяткаваў брыльянтавы юбілей. За 75 гадоў свайго творчага шляху ён стаў сапраўдным храмам беларускай культуры, неад'емнай прыналежнасцю нацыі.

Семдзесят пяць год -- шаноўны ўзрост і для чалавека, і для гісторыі. Але, бадай, у адносінах да тэатра нельга сказаць, стары ён ці малады. У тэатра няма ўзросту. "Тэатр, -- лічыць галоўны рэжысёр купалаўцаў Валерый Раеўскі, -- не старэе і не маладзее, ён проста мяняецца разам з эпохай".

Але, нягледзячы на змену эпох, купалаўскі заўсёды заставаўся тэатрам беларускім. І нацыянальныя якасці яго рэжысёраў і акцёраў вызначалі дух, тоны і паўтоны спектакляў, што ўласціва толькі гэтай трупе. І што б ні ставіў тэатр -- Брэхта ці Шэкспіра, Чэхава ці Астроўскага, Макаёнка ці Дударава -- іх спектаклі прапускалі праз беларускую душу.

Лепшыя спектаклі нацыянальнай драматургіі -- "Паўлінка" Я.Купалы, "Трыбунал" А.Макаёнка, "Людзі на балоце" І.Мележа, "Радавыя" А.Дударава, "Ідылія" В.Дуніна-Марцінкевіча -- упершыню ўбачылі свет рампы ў купалаўцаў. Акцёры і рэжысёры ў гэтых спектаклях змаглі пакарыць гледача сваім незвычайным, толькі ім уласцівым каларытам мовы, пачуццяў, драматургічных калізій.

НА ЗДЫМКАХ: будынак тэатра імя Янкі Купалы вечарам; такой была трупа тэатра ў 1924 годзе.

(На 7-й старонцы змешчана інтэрв'ю з вядучай актрысай Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы Ліліяй ДАВІДОВІЧ).



ЦІ ЎДАСЦА Юрыю БУДЗЬКО

РАЗБУРЫЦЬ ДЗЯРЖАЎНУЮ МАНАПОЛІЮ?

МАГІЧНЫ СУСВЕТ "МЭДЖЫКА"

Вядома, што інфармацыі ніколі не бывае зашмат. У Беларусі гэта зразумелі, аднак, толькі тады, калі планавая гаспадарка пачала мяняць накірунак да рынкавых адносін. Недахоп інфармацыі адчулі ў першую чаргу кіраўнікі прадпрыемстваў, якія цяпер самі павінны шукаць і тавар, і сыравіну, а таксама пакупнікоў на свае вырабы. У разгубленасці апынуліся і звычайныя спажыўцы, якія, каб набыць тую ці іншую рэч, усё часцей вымушаны былі звяртацца да рэкламы ў газетах.

Каля двух гадоў таму Юрый Будзько, цяперашні генеральны дырэктар [illegible] "Мэджык Інкарпарэ[illegible]", трапіў у сітуацыю, якая падштурхнула яго да стварэння выдавецкага дома. Аднойчы яму спатрэбілася купіць факс. Ён перагартаў з дзесятак газет, але выбіраць а[illegible]ва не было з чаго: некальк[illegible]аратаў па астранамічных цэнах. Паколькі губляць час на негарантаваныя пошукі не вельмі хацелася, мусіў спадар Будзько набыць першы апарат, які яму трапіўся. Праз пару дзён ён выпадкова ўбачыў інфармацыю і даведаўся, што такую ж мадэль факс-апарата можна было набыць на 70 долараў танней. Менавіта гэты выпадак падштурхнуў Юрыя пачаць выданне зборніка, які ўключаў бы ўсю рэкламу з газет, часопісаў, радыё і тэлебачання і які б дапамог беларускаму спажыўцу зарыентавацца ў нашым пакуль што хаатычным рынку.

Так пабачыў свет першы выпуск даведніка "Цэны і тавары сёння", які меў спачатку ўсяго 24 старонкі і наклад 45 асобнікаў. Праз два гады ён ужо выходзіць у пяці тамах (аргтэхніка, транспарт, абсталяванне і будаўніцтва, спажывецкія тавары, прадукты харчавання) на 500 старонках і накладам 4 000 экземпляраў. Зборнік уключае звыш 20 000 аб'яў з 42 газет і ад уласных падпісчыкаў. Гэта быў першы крок на шляху прарыву інфармацыйнай блакады на беларускім рынку.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ДЛЯ КАГО ПАДЗЕЯ, ДЛЯ КАГО НЕ

"НОВЫ ЗАПАВЕТ" ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ

"1. Калі настаў дзень Пяцідзесятніцы, усе яны былі аднадушна разам.

2. І раптам зрабіўся шум зь неба, як бы ад паневу моцнага ветру. І напоўніў увесь дом, дзе яны былі.

3. І зьявіліся ім языкі падзеленыя, як бы вогненныя, і апусьціліся па адным на кожнага зь іх.

4. І напоўніліся ўсе Духам Сьвятым і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім вяшчаць.

5. А ў Ерусаліме былі Юдэі, людзі набожныя, з усякага народу пад нябёсамі.

6. Калі зрабіўся гэты шум, сабраліся людзі. І захваляваліся, бо кожны чуў іх, што гавораць на ягонай мове.

....

12. І зьдзіўляліся ўсе і недаумёна казалі адзін аднаму: што гэта азначае!"

(Дзеі 2 : 1--6, 12).

Менавіта так і гэтымі словамі выдрукаваны прыведзены фрагмент з "Дзеяў Сьвятых Апосталаў" у кнізе, якая мае назву "Новы Запавет. Псалтыр". Яна выдадзена выдавецкім цэнтрам "Бацькаўшчына" сёлета ў Мінску. Пра сэнс новазапаветнага фрагмента дазволю сабе пераразважаць пазней. Цяпер жа паведамлю, што 14 лістапада ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя гэтага выдання.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ

НАРАДА ПРЭЗІДЭНЦКАЙ "ВЕРТЫКАЛІ"



20--21 лістапада прайшла рэспубліканская нарада кіраўнікоў абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў па пытаннях павышэння эфектыўнасці работы выканаўчых органаў улады. На нарадзе выступіў з дакладам Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА (на здымку).

З ДАКЛАДА ПРЭЗІДЭНТА

За тры гады, з 1991 па 1994, Рэспубліка Беларусь практычна страціла, як піша вядомы амерыканскі эканаміст-аналітык доктар Д.Хансен, "...рэпутацыю лепшага ўзору сацыялістычнай індустрыялізацыі. Вельмі цяжкія ўзрушэнні, звязаныя са стратай танных энерганосьбітаў, традыцыйных рынкаў збыту, паставілі рэспубліку ў вельмі цяжкае становішча". І трэба прызнаць, што ён мае рацыю. Недаацэньваючы важнасць сувязі паміж узроўнем спажывання і эфектыўнасцю вытворчасці, у рэспубліцы і праводзілася палітыка "праядання" раней накопленага капіталу. І як вынік гэтага -- фарміраваліся даўгі, стваралася ілюзія эфектыўнай работы прадпрыемстваў і магчымасці пазбегнуць эканамічнага крызісу.

Сітуацыя патрабавала прыняцця неадкладных і рашучых мераў, а значыць -- і вышэйшай адказнасці канкрэтнага чалавека за лёс краіны. Мы пайшлі на гэтыя меры.

Нягледзячы на крайнія цяжкасці, перш за ўсё быў стабілізаваны абменны курс нацыянальнай валюты, закладзены ўмовы для дасягнення макраэканамічнай стабілізацыі ў цэлым. Тэмпы інфляцыі знізіліся з 40 да 2,5 працэнта ў месяц, а рэальны бюджэтны дэфіцыт з двухзначнай велічыні -- [illegible] 1 працэнта да валавога ўнутранага прадукту. [illegible]публіка цяпер поўнасцю аплачвае Расіі бягучыя рахункі за энергарэсурсы і бесперабойна атрымлівае жыццёва неабходныя нафту і газ, запасы якіх напярэдадні зімы дасягнулі ўзроўню 1989 -- 1990 гадоў савецкага часу.

У першым паўгоддзі 1995 года ўзрасла вытворчасць асноўных відаў прадуктаў нафтаперапрацоўкі (на 17 працэнтаў), мінеральных угнаенняў (на 40 працэнтаў).

Устойліва працавала энергетыка, торфаздабыўная і дрэваапрацоўчая прамысловасць. Мы, няхай і марудна, але паслядоўна ідзём да парытэту цэн паміж прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, калі гэты парытэт магчымы наогул без датацый з дзяржаўнага бюджэту.

Адчувальныя вынікі былі дасягнуты ў знешнім гандлі. Рэспубліка дабілася значнага дадатнага сальда гандлёвага балансу з краінамі далёкага замежжа (57 мільёнаў долараў у 1994 годзе і каля 250 мільёнаў долараў за 9 месяцаў гэтага года).

Сярэдняя заработная плата вырасла ў пяць разоў і дасягнула 72 долараў у месяц. Па гэтым паказчыку, таксама, як і па ўзроўню сярэдняй пенсіі (46 долараў), мы крыху адстаём толькі ад Расіі. Нягледзячы на рост цэн, асабліва ў першым квартале, па ўзроўню жыцця мы выглядаем не горш, чым большасць краін СНД. Гэта я гавару для даведкі і прасвятлення тых палітыкаў, а таксама прыватных і быццам бы незалежных інфармацыйных агенцтваў, журналістаў, якія навязваюць народу выгадную толькі для іх думку аб эканамічнай катастрофе і нібыта адсталасці Беларусі ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Да нашай эканамічнай палітыкі расце давер сусветнага супольніцтва. І ў гэтым я абсалютна пераканаўся пасля сустрэчы з буйнымі бізнесменамі, дзелавымі людзьмі з ЗША тут у нас, у Мінску, і асабліва ў ходзе паездкі на юбілейную сесію Генеральнай Асамблеі, прысвечаную 50-годдзю ААН. Аб гэтым гаворыць і той факт, што бізнесмены Германіі папрасілі аб сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі, якая адбудзецца ў бліжэйшы час.

Цікавасць да Беларусі, яе навуковага, прамысловага, высокатэхналагічнага патэнцыялу на Захадзе даволі высокая. І гэта рэальны факт, як бы ні хацелася іншага ўсім тым, хто прыклаў нямала намаганняў, каб стварыць з нашай краіны вобраз адсталага і апошняга, нейкага "камуністычнага запаведніка" ў Еўропе, зляпіць з грамадзян рэспублікі вобраз быццам бы "малаадукаванага" і "хворага" народа, а з Прэзідэнта -- "дыктатара і ўзурпатара".

Да гэтай няўдзячнай місіі прыніжэння ўласнай радзімы, нашага народа, які перанёс жахі Вялікай Айчыннай вайны і Чарнобыля, прыклалі руку, і не бясплатна, некаторыя былыя банкіры і міністры, палітыканствуючыя нацыяналісты і іншыя "былыя". У тым ліку і дэпутаты старога Вярхоўнага Савета, якія цяпер зноў рвуцца ў новы Вярхоўны Савет усімі магчымымі і немагчымымі шляхамі.

Насуперак іх надзеям ужо прынята канчатковае рашэнне аб прадастаўленні Міжнародным валютным фондам пазыкі на стабілізацыю эканомікі рэспублікі, у першую чаргу яе крэдытна-фінансавай сістэмы. Пры гэтым мы не адмовіліся ні ад нашых палітычных інтарэсаў, ні ад эканамічнай незалежнасці.

Падпісана пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве з Еўрапейскім саюзам. Камісіяй еўрапейскіх супольніцтваў прынята прынцыповае рашэнне аб выдзяленні Беларусі крэдыту на падтрыманне плацежнага балансу.

Падрыхтавана пазыка Сусветнага банка на развіццё і падтрымку прыватных прадпрыемстваў і структурных эканамічных рэформаў. Акрамя таго, мной і ўрадам праведзены перагаворы з місіяй Сусветнага банка, у выніку якіх дасягнута ўзаемаразуменне па эканамічных і палітычных праблемах Беларусі. Выпрацоўваецца стратэгія інвестыцыйнай дзейнасці гэтага банка ў эканоміку Беларусі.

Нам удалося адысці ад краю бездані, але стабілізацыя ўсё-такі мае няўстойлівы характар. Эканоміка, на жаль, марудна выходзіць з крызіснага стану.

* * *

Прэзідэнт і ўся выканаўчая ўлада зацікаўлены ў канструктыўнай крытыцы. Давайце спрачацца, д[illegible]це выбіраць лепшае. Але крытыка агульная, некампетэнтная, накіраваная не на вырашэнне праблем, а на распальванне эмоцый, дэстабілізацыю абстаноўкі будзе і ў далейшым сустракаць жорсткі адпор.

Я скажу больш. Сёння радыкал-нацыяналістычная апазіцыя пры падтрымцы ценявых мафіёзных структур у поўным сэнсе слова імкнецца да ўлады, да бязмежнай дыктатуры. Ускормленыя на "брудныя" грошы, палітыкі і сродкі масавай інфармацыі нагнятаюць у грамадстве масавы псіхоз, нацкоўваюць насельніцтва на дзяржаўныя структуры, на Прэзідэнта.

Усе іх разважанні аб свабодзе друку, вяршэнстве закона -- не больш чым прапагандысцкае прыкрыццё адкрытай прагі рэваншу за знішчальнае паражэнне, якое пацярпела апазіцыя на прэзідэнцкіх выбарах, на першым этапе выбараў у парламент і ў ходзе рэферэндуму. Вельмі шкада, але і на другім флангу ім пачынаюць падпяваць учарашнія непрымірымыя. Усе аб'ядналіся ў барацьбе супраць Прэзідэнта. Ну што ж. Справа ваша...

Паглядзіце, як ліхаманкава праводзяць яны свае з'езды, кангрэсы, сімпозіумы, "круглыя сталы", раздаюць адзін аднаму доларавыя "кармавыя". На гэтых сходках, фінансуемых з добра вядомых крыніц, ужо адкрыта гучаць заклікі выводзіць народ на вуліцы.

Таварышы кіраўнікі! Не жывіце ілюзіямі. Калі нацыяналістычная суполка "спадароў" установіць сваю дыктатуру, для многіх з вас і вашых сем'яў адразу ж паўстане пытанне аб асабістай бяспецы. Галоўная ж задача нацыяналістычнай дыктатуры -- усталяваць уладу крымінальнага капіталу і крымінальнай мафіі, каб канчаткова разрабаваць і вывезці ў чужыя банкі народны набытак. Нездарма для іх ідэалам з'яўляецца недалёкая прыморская дзяржава, дзе трэць валавога нацыянальнага прадукту забяспечваецца за кошт кантрабанды зброі і наркотыкаў, яшчэ адна трэць -- за кошт кантрабанды каляровых металаў і толькі трэць -- за кошт уласнай вытворчасці. А што датычыць палітычнай сітуацыі, то амаль палова насельніцтва гэтага вельмі невялікага па тэрыторыі прыморскага "раю" поўнасцю пазбаўлена элементарных палітычных, сацыяльных і эканамічных правоў, аб парушэнні якіх была афіцыйная заява ААН.

У мяне моцныя нервы. Не выйдзе, панове! У полымі агрэсіўнай балбатні і абяцанняў, якое вы раздзімаеце, згарацы перш за ўсё вашы амбіцыі і дамаганні на антынацыянальную і антынародную дыктатуру! Але і вы, кіраўнікі выканаўчай улады на месцах, не павінны сядзець склаўшы рукі. Вы абавязаны, абапіраючыся на канстытуцыйныя нормы, у кожнай вобласці, у кожным раёне пакласці канец разгулу экстрэмісцкіх і мафіёзных элементаў, пад якімі б перавернутымі лозунгамі яны ні выступалі. І гэта -- ваш прамы канстытуцыйны доўг, прамы абавязак перад народам.

ПРЫЗНАЧЭННІ

У ДЫПЛАМАТЫЧНЫМ ВЕДАМСТВЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб назначэнні Івана Антановіча намеснікам міністра замежных спраў рэспублікі. Яму прысвоены дыпламатычны ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь.

Указам Прэзідэнта Пётр Бяляеў назначаны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Германіі. Ён вызвалены ад пасады намесніка міністра замежных спраў.

СЛОВА ЗА СУДОМ

СПРАВА ПРА ЗАГІНУЎШЫХ АНГЛІЧАН

Судовая калегія па крымінальных справах Гомельскага абласнога суда пачала разгляд справы па факту гібелі двух грамадзян Вялікабрытаніі.

Яны прыбылі ў Гомель сёлета ў складзе афіцыйнай дэлегацыі і ў час купання на рацэ Сож трапілі пад вінт прагулачнага цеплахода. Транспартная пракуратура, правёўшы стараннае расследаванне здарэння, абвінавачвае ў гэтым капітана цеплахода "Буравеснік" Алега Гаўрылюка. Але канчатковае слова, як заўсёды, застаецца за судом.

СВАБОДНЫЯ ПРАФСАЮЗЫ

КАНЕЦ СПРАВЫ

Згодна з заключэннем Канстытуцыйнага суда, які прызнаў незаконнымі шэраг пунктаў прэзідэнцкага ўказа N 336 "Аб некаторых мерах па забеспячэнню стабільнасці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь", зняты арышт з банкаўскага рахунку (банк "Дукат") Свабоднага прафсаюза Беларусі. Аб гэтым БелаПАН паведамілі ў штаб-кватэры СПБ.

Завяршыўся нарэшце і судовы працэс, што працягваўся амаль два месяцы, па іску звольненых работнікаў Мінскага метрапалітэна, якія прымалі ўдзел у жнівеньскай забастоўцы і якія з'яўляюцца членамі Свабоднага прафсаюза. Толькі трое з іх аднаўлены на рабоце, астатнія 25 -- высокакваліфікаваныя машыністы і слесары -- засталіся без справы.

ЗАСТУПНІЦТВА ПРЭЗІДЭНТА

ПРАФЕСАР КУЧАРАЎ ВЫЗВАЛЕНЫ ПАД ЗАЛОГ

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў аддзеле друку і інфармацыі беларускага МЗС, 20 лістапада са следчага ізалятара ў Вільнюсе ў сувязі з цяжкім станам здароўя пад заклад, унесены Рэспублікай Беларусь, вызвалены грамадзянін Беларусі І.Кучараў.

Прафесар Кучараў знаходзіўся пад следствам у сувязі з расследаваннем трагічных падзей студзеня 1991 года ў Літве. Яго вызваленне адбылося пасля асабістага звароту Аляксандра Лукашэнкі да кіраўніка літоўскай дзяржавы Альгімантаса Бразаўскаса і вялікай работы, праведзенай Міністэрствам замежных спраў Беларусі.

21 лістапада І.Кучараў у суправаджэнні супрацоўнікаў Пасольства Беларусі ў Літве прыбыў у Мінск для лячэння.

ЧАЛАВЕК І ЯГО СПРАВА

ПОЛЕ УЛАДЗІМІРА МАЦВІЕНКІ

39 сартоў бульбы з вялікім утрыманнем сухіх рэчываў, якія, мусіць, нідзе ў свеце больш не сустракаюцца, 15 сартоў фасолі, амаль усе сарты вырошчваемых у СНД кабачкоў, многія іншыя агародніння культуры ўтрымліваюцца ў калекцыі былога радыёфізіка, а цяпер прапагандыста рацыянальнага земляробства з Гомеля Уладзіміра Мацвіенкі.

Пасля выхаду ў 1990 годзе на пенсію энтузіяст паставіў перад сабой мэту распаўсюджваць бязвірусны метад вырошчвання бульбы, а таксама змяніць структуру плошчаў пасадкі культур па Гомельскай вобласці з ухілам на бялкова-вітамінную прадукцыю. У рэалізацыі пастаўленых задач яму дапамагаюць жонка -- кандыдат медыцынскіх навук, дачка -- кандыдат сельскагаспадарчых навук, сын -- кіраўнік Біятэхналагічнага цэнтра і брат -- доктар фізіка-матэматычных навук.

ЛЕПШЫЯ КНІГІ

ПРЭМІІ "ЮНАЦТВА"

Падведзены вынікі конкурсу на лепшыя кнігі, выпушчаныя выдавецтвам "Юнацтва" ў 1994 годзе.

Ён праходзіў у некалькі этапаў. І нарэшце журы, у саставе якога былі пісьменнікі, назвала лепшыя кнігі года: у жанры прозы -- раман Генрыха Далідовіча "Заходнікі" (прэмія імя Міхася Лынькова) -- твор аб нялёгкім жыцці вёскі ў пасляваенны час у былой Заходняй Беларусі, у жанры паэзіі -- зборнік вершаў, лічылак, загадак, скарагаворак Міхася Пазнякова "Ехаў поўны воз дзівос" (прэмія імя Петруся Броўкі). За мастацкае афармленне прэмію атрымала Антаніна Лапіцкая за ілюстрацыі да кніг "Біблія" і "Удовін сын".

МАГІЧНЫ СУСВЕТ "МЭДЖЫКА"

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Відавочна, аднак, што інфармацыя павінна быць сістэматызаванай, змястоўнай, аператыўнай. А таму пры выдавецкім доме "Мэджык" была створана эфектыўная кур'ерская служба. Сёння ўсе 4 000 падпісчыкаў атрымліваюць зборнік кожны аўторак. Усе яны маюць таксама магчымасць размяшчаць у ім сваю рэкламу, што робіць яго асабліва прывабным для кіраўнікоў прадпрыемстваў. Зборнікам зацікавіліся ў Літве, Латвіі, Расіі, іншых краінах.

Але на дасягнутым Юрый Будзько і яго маладая каманда, сярэдні ўзрост якой усяго 23 гады, не захацелі спыніцца. Іх дэвіз "Мы ведаем усё" спрыяе пашырэнню інфармацыйнай прасторы ў Беларусі. Вельмі хутка быў заснаваны часопіс "Фінансы", які ўключае аналітычныя артыкулы, банкаўскія і ўрадавыя дакументы, а таксама часопіс "Бездельник", у які ўваходзіць пацяшальна-займальная інфармацыя на бліжэйшы тыдзень (музеі, выставы, кафэ, бары, відэа- і кніжныя рынкі і г.д.). Зусім нядаўна ён перайменаваны ў "Уік-энд". Часопісы сталі вельмі папулярнымі сярод чытачоў. Распрацаваны таксама дзве праграмы "Інфармацыя сёння на сёння". Са жніўня гэтага года кампанія пачала працаваць разам з тэлефоннай службай-даведкай **0-67**. Патэлефанаваўшы па гэтым нумары, можна бясплатна атрымаць любую інфармацыю аб усіх таварах, рынку фінансавых, бытавых і іншых паслуг у краіне. Другая праграма -- факс-інфарматар -- ультрасучасная сістэма абмену інфармацыяй. Набраўшы нумары **590-599 або 579-776** на факс-апараце ў любы час дня і ночы, кліент можа атрымаць распячатку, таксама бясплатна, усіх тавараў ці паслуг, якія яго цікавяць. Ідэй і перспектыў у выдавецкага дома "Мэджык" надта многа, але ўсе яны паступова ажыццяўляюцца дзякуючы энергіі і намаганням іх галоўнага генератара Юрыя Будзько. Па адукацыі гукарэжысёр, былы аранжыроўшчык, ён дагэтуль захаваў любоў да музыкі. Пры выдавецкім доме працуе клуб "Тры парсючкі", у якім збіраюцца прыхільнікі рок-н-рола і іншай музыкі.

У самым хуткім часе пачынае працу яшчэ адно дачынае прадпрыемства кампаніі "Мэджык", якое мае намер разбурыць манаполію "Саюздруку".

"Да "Саюздруку" я маю свае прэтэнзіі, -- распавядае Юрый Будзько. -- Некалі я быў рэдактарам вельмі папулярнай газеты "Сарока". Яе добра куплялі, але "Саюздрук" мяне разарыў, бо па паўгода затрымліваў выплату грошай за яе распаўсюджванне. Калі грошы нарэшце вярнулі, іх праглынула інфляцыя. Вельмі хочацца ім паказаць, як трэба працаваць цывілізавана. Працуем мы і над стварэннем альтэрнатыўнага падпіснога каталога па дастаўцы розных выданняў і ўжо маем шмат заказчыкаў.

Наогул я мушу прызнацца, што ў бізнесе мяне падштурхоўвае эгаістычны пачатак. Я заўсёды рабіў і раблю толькі тое, што мне цікава і што мне падабаецца. Калі ідэя пачынае працаваць, мне робіцца нудна, і я шукаю чалавека на сваё месца, і фірма працуе ўжо амаль без майго ўдзелу. Далей я распачынаю якую-небудзь іншую справу. Вось і цяпер я перадаю выдавецкі дом у іншыя рукі. У мяне ёсць даўняя мара -- выдаваць кнігі. А таму я працую над стварэннем уласнай друкарні. У мяне ёсць дзве кнігі, якія я напісаў сам, сам хачу і выдаць".

Першы незалежны выдавецкі комплекс "Rockwall International" нядаўна перасёк мяжу Беларусі. Калі справа будзе наладжана, можна не сумнявацца, што будзе разбурана нарэшце манаполія і дзяржаўнага Дома друку, а гэтага даўно чакаюць незалежныя СМІ. У рамках дзейнасці самой кампаніі "Мэджык" стварэнне друкарні -- гэта лагічнае завяршэнне ўсяго выдавецкага цыклу, які пачаўся зборам інфармацыі і выданнем невялічкага тады даведніка трошкі болей за два гады таму. Можна меркаваць, што і на гэтым Юрый Будзько не спыніцца. Ён належыць да тых шчаслівчыкаў, на якіх ідэі валяцца "Ньютанавымі яблыкамі" і хутка знаходзяць сваё ажыццяўленне. Гэтыя ідэі не даюць сумаваць ні яму, ні яго калегам, а праца прыносіць задавальненне і радасць ад адчування таго, што кожны крок іх дзейнасці -- гэта крок наперад да прагрэсу, набліжэнне да сусветных стандартаў, што, у сваю чаргу, прыспешвае і спрыяе далучэнню Беларусі да цывілізаванай супольнасці.

Таіса БАНДАРЭНКА.

ПОГЛЯД САЦЫЁЛАГА

ІНФАРМАЦЫЯ — ДАРАГІ ТАВАР

-- Аляксандр Пятровіч, з часу майскага рэферэндуму мінула паўгода -- тэрмін даволі значны для развіцця грамадскай думкі. Што паказваюць вашы апытанні: ці захавала значная частка нашых грамадзян свае погляды на ўзнятыя тады праблемы?

-- Тут дынаміка наступная: увесь час пакрысе зніжаецца колькасць прыхільнікаў канфедэратыўных адносін з Расіяй, а колькасць прыхільнікаў поўнай незалежнасці Беларусі павялічваецца. Тэмпы невысокія, але стабільныя. Я прывяду даныя некалькіх апытанняў. Возьмем, напрыклад, Мінскую вобласць (без горада Мінска). Было пастаўлена пытанне: як, па-вашаму, павінны будавацца адносіны з Расіяй пры цяперашнім расійскім кіраўніцтве і цяперашніх умовах, што там склаліся? За ўваход Беларусі ў склад Расіі на правах аўтаноміі выказалася 3-4 працэнты; за канфедэрацыю -- 18-20 працэнтаў; за незалежную Беларусь пры эканамічным і палітычным саюзе з Расіяй -- 35 працэнтаў; за тое, каб адносіны з усімі дзяржавамі былі аднолькавымі,— 18-19 працэнтаў; за першачарговую арыентацыю на заходнія краіны -- 6 працэнтаў. І гэтыя лічбы даволі тыповыя, у розных апытаннях магчымы адхіленні плюс-мінус 2-3 працэнты. Такім чынам, большасць грамадзян Беларусі падтрымлівае незалежнасць сваёй краіны, а што тычыцца адносін з Расіяй, то жадалі б захавання ранейшых сацыяльных сувязей: каб не было мяжы, каб можна было, як раней, з'ездзіць у Маскву, да сваякоў... Прычым людзі не хочуць чакаць, ім патрэбна ўсё гэта зараз, сёння.

Як бачым, развіццё нацыянальнай самасвядомасці не стаіць на месцы, развіваецца, але яно не будзе выглядаць такім, якім яго жадалі б бачыць нашы нацыянальныя радыкалы. Хутчэй за ўсё не будзе апантаных барацьбітоў са сцягамі ў руках, якія дзень і ноч змагаюцца за беларускую мову. Дарэчы, каб так здарылася, то гэта было б, я лічу, даволі небяспечна. Бо незалежна ад таго, за якую ідэю ідзе змаганне -- палітычную, рэлігійную, нацыянальную, але калі яна атрымлівае вось такіх прыхільнікаў, якія ўрэшце атрымліваюць уладу, то і дзейнічаюць яны тады адпаведным чынам. Падабаецца каму ці не, але факт застаецца фактам: многіх адштурхнула становішча, што склалася ў школах пасля актыўнага ўвядзення там беларускай мовы. Прывяду прыклад. Я размаўляў з выкладчыкам матэматыкі, калі да нас падышоў выкладчык беларускай мовы. Матэматык жарт[illegible] сказаў, маўляў, не ведаю[illegible]уду працаваць на беларуска[illegible]мове. На што калега "заспакоіў": не хвалюйцеся, мы вас паважаем, вы застаняцеся на сваім месцы. І гэта казаў чалавек, які па закону мае такі ж статус[illegible] выкладчык матэматыкі, [illegible] ён ужо адчуваў сябе вышэй за калегу.

-- Магчыма, выкладчык беларускай мовы таксама пажартаваў?

-- Не, усё было вельмі сур'ёзна. Урэшце, мы ведаем, што асабліва ў вышэйшых навучальных установах ледзь не ідэалагічныя камісіі ствараліся. І зноў падкрэслю, гэта адштурхнула вельмі і вельмі многіх прадстаўнікоў інтэлігенцыі, асабліва рускамоўных, якіх у нас большасць.

Праяўляючы цалкам неабходны і заканамерны клопат пра нацыянальную культуру, трэба памятаць (асабліва гэта тычыцца адукаваных людзей), што галоўная каштоўнасць канца XX стагоддзя, як і пачатку XXI, -- правы чалавека, грамадзяніна, і гэта зусім не азначае няўвагу да нацыянальных праблем. Хаця на практыцы нярэдка атрымліваецца так, што дзве гэтыя каштоўнасці -- правы асобы і правы нацыі -- у свядомасці многіх палітычных сіл уступаюць у канфлікт паміж сабой.

-- Дарэчы, пра палітычныя сілы. Хутка паўторныя парламенцкія выбары. Пра што гавораць вашы апытанні: за каго цяпер будуць галасаваць выбаршчыкі -- за партыі ці за асобаў?

-- Мы праводзілі ўжо некалькі падобных апытанняў. Вось даныя аднаго з іх. На пытанне, што найбольш важна пры выбары кандыдата, за якога будуць галасаваць, прывабнасць перадвыбарчай праграмы адзначылі 13-14 працэнтаў апытаных; шырокую вядомасць кандыдата -- 10-11 працэнтаў; уменне абараніць інтарэсы выбаршчыкаў -- 20-30 працэнтаў. Вось асноўны матыў галасавання.

-- Значыць, у першую чаргу людзі арыентуюцца на асобу, а не на яе партыйную прыналежнасць?

— І не проста на асобу. Яшчэ на першых выбарах у бок выбаршчыкаў прагучала шмат папрокаў за тое, што яны аддалі свае галасы мясцовым кіраўнікам -- старшыням калгасаў, райвыканкомаў. Але і гэта -- тыповыя паводзіны сучаснага заходняга выбаршчыка ў цывілізаванай сучаснай краіне. Там таксама не кінуцца хутчэй выбіраць якога-небудзь красамоўнага інтэлігента, які будзе апантана разважаць пра свабоду і дэмакратыю. Там таксама вельмі часта галасуюць за мясцовага бюракрата або ўладальніка фірмы, завода, дзе працуе амаль увесь горад, там таксама выбіраюць таго, каго ведаюць, хто праявіў сябе на справе. І палітычная кар'ера на Захадзе будуецца прыкладна па такім жа ланцужку, як і ў нас: напрыклад, мэр маленькага гарадка, мэр вялікага горада, сход штата, губернатар і далей. Гэта нармальныя паводзіны. Але ў нас чамусьці некаторым ўяўляецца, што дастаткова прачытаць некалькі дэмакратычнага накірунку кніг, вылучыць з дзесятак пафасных нацыянальных лозунгаў, і ўсе пабягуць галасаваць за такога інтэлектуала. Мы ўжо галасавалі за іх, і яны шмат чаго ўжо нарабілі ў краіне. Дарэчы, у многіх людзей проста існуе недавер да ідэалагічных тэорый інтэлектуалаў. Але тым не менш, увага да прафесійнай падрыхтоўкі палітыка расце. Эканамічная або юрыдычная адукацыя кандыдата можа аказацца вельмі важным фактарам у вачах выбаршчыкаў.

Увогуле сітуацыя такая, што насельніцтва пойдзе на выбары не будучы заідэалагізаваным, у нейкай меры нават будзе дэпалітызаваным. Што зусім нядрэнна. Дрэнна іншае: перадвыбарчай кампаніі, як такой, практычна няма. Улады ўсё "зацерлі". Гэта, я б сказаў, крайне памылковая пазіцыя, бо менавіта выбарчыя кампаніі фарміруюць у грамадстве шырокую палітычную культуру, узбагачаюць сацыяльны вопыт. Было б добра, каб выбары сталі нават нечым накшталт азартнай палітычнай гульні, выклікалі дыскусіі, але не пакідалі людзей такімі абыякавымі, як у нас. Бо да той пары, пакуль не пройдзе некалькі цыклаў нармальных выбарчых кампаній, у час якіх масы будуць ангажыраваны, захоплены, да таго часу мы не сфарміруем нармальныя стэрэатыпы палітычных паводзін, і як вынік, застанецца рызыка пранікнення ў той жа парламент выпадковых, непадрыхтаваных людзей.

-- А рэйтынг беларускага Прэзідэнта расце ці падае? Што на гэты конт кажуць лічбы?

-- Ну, я не ведаю такіх сацыёлагаў, якія б казалі, што рэйтынг Прэзідэнта расце. Я думаю, што большасць маіх калег пагодзяцц[illegible]лі я скажу, што рэйтынг [illegible]зідэнта проста аб'ектыўна не можа павышацца: Лукашэнка ажыццяўляе крайне жорсткую фінансавую палітыку -- мы на сваіх зарплатах гэта ад[illegible]ем. Разам з тым ён не пра[illegible]іць эфектыўныя рэформы, і ўзровень жыцця рэзка зніжаецца. Але ёсць у Прэзідэнта пэўны запас трываласці -- 13-15 працэнтаў насельніцтва падтрымліваюць яго безагаворачна. Увогуле існуе тэрмін -- 3 гады, які праходзіць палітык ад вялікага даверу, папулярнасці да расчаравання ў ім, калі нічога не здолеў зрабіць на справе. Тры гады спатрэбіліся Гарбачову, каб спазнаць і агульнае прызнанне, і поўнае раўнадушша, тое ж прыкладна адбываецца з Ельцыным. Ёсць шанс трапіць у гэты шэраг і ў Лукашэнкі, нават калі ён пачне нарэшце праводзіць сапраўдныя рэформы, вынік якіх не можа быць хуткім. Але калі жыццё палепшыцца, шансы яго, безумоўна, узрастуць, час яшчэ ёсць.

Для прыкладу, прывяду наступнае апытанне. З меркаваннем "усё не так дрэнна, і можна жыць" згодныя 7--8 працэнтаў, "жыць цяжка, але можна цярпець" -- 34-36 працэнтаў, "так далей жыць немагчыма" -- больш за 50 працэнтаў. Ну якія тут можна чакаць адносіны да ўлады? Аднак хачу падкрэсліць, што ўладу трэба крытыкаваць -- гэта нармальна, але кідацца на яе толькі з крыкамі "ату" -- не варта. Асабліва гэта тычыцца прэсы, да якой, на жаль, наша ўлада ў сваю чаргу таксама ставіцца цалкам нецывілізавана. Паўсюль патрэбны дыялог. На пытанне: "Што больш за ўсё ўскладняе жыццё сям'і?" 70 працэнтаў адзначылі нізкія даходы. "На якія выдаткі хапае вашай сям'і грошай?" Тых, каму грошай не хапае нават на самае таннае харчаванне альбо, калі і хапае, то толькі на харчаванне, у цэлым 75 працэнтаў -- дзве трэція насельніцтва.

-- Але парадокс у тым, што нават пры такім становішчы вельмі пашырана меркаванне: "цар -- добры, баяры -- дрэнныя".

-- Згодны, тут таксама адна з загадак сацыялогіі -- чаму людзі так думаюць. На гэтае пытанне шукаюць адказ і ў нас, і ў Расіі. Здавалася б, ужо павінен быў пачацца нейкі масавы бунт, здавалася б, людзі павінны ўжо выйсці на плошчы, бо падзенне ўзроўню жыцця проста трагічнае: калі гадоў праз дваццаць падлічаць цану рэформ, таго, што адбываецца ў былым Савецкім Саюзе, яна будзе параўнальнай з цаной, магчыма, другой сусветнай вайны. Узровень жыцця за апошнія 2-3 гады вярнуўся на 20 гадоў назад, гэта значыць, што ў былым СССР дзесяткі мільёнаў людзей змянілі структуру харчавання, спосаб адпачынку. У выніку шмат пажылых людзей памерлі раней, чым гэта здарылася б пры ранейшым ладзе жыцця. Назіраецца адмоўная дынаміка нараджальнасці, і яна будзе мець працяг, бо чалавек, які вырас адзіным дзіцем у сям'і, звычайна таксама мае толькі адно дзіця.

-- Урэшце, здароўе -- гэта сапраўды "хворае" месца ў нашым грамадстве.

-- А як можа быць інакш, калі 60 працэнтаў насельніцтва не лічаць уласнае здароўе прыярытэтным у сістэме жыццёвых каштоўнасцей. Увогуле я ахарактарызаваў бы нашу непаўторную супольнасць так: індустрыяльнае грамадства з падкрэслена даіндустрыяльнай культурай.

-- І ўсё ж такі, які палітычны накірунак больш папулярны ў жыхароў Беларусі?

-- Спачатку я б адзначыў, што зараз на Беларусі назіраецца найвастрэйшы крызіс палітычнага лідэрства. Новыя палітыкі -- асобы вядомыя, але не з'яўляюцца высокааўтарытэтнымі ў вялікіх груп насельніцтва, і назваць іх нацыянальнымі лідэрамі немагчыма. Што тычыцца палітычных партый, то, можа і дзякуй Богу, што такой вялікай партыйнай заангажыраванасці насельніцтва няма. Ёсць схільнасць да пэўных палітычных арыентацый, але часцей за ўсё яна не атаясамліваецца з нейкімі канкрэтнымі партыямі. Ёсць тыя, хто зарыентаваны ўлева, управа, ёсць ліберальны вектар, асабліва сярод інтэлігенцыі, і сацыялістычны вектар. Карціна складваецца даволі разнастайная, але ўдакладніць і канкрэтызаваць яе змогуць толькі самі выбары. Мы ж прааналізуем факты і зробім свае высновы і прагнозы. Дарэчы, тэлефон нашага цэнтра: **32-15-85**.

Гутарку вяла Галіна УЛІЦЁНАК.

Заканчэнне. Пачатак у № 47.

"НОВЫ ЗАПАВЕТ" ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Выхад у свет новага беларускага перакладу Святога Пісьма прызнаныя аўтарытэты ўважаюць выдатнаю падзеяй нашага духоўнага і культурнага жыцця, а дасягненне перакладчыка Васіля Сёмухі -- подзвігам беларускага адраджэння. Падзея гэтая сапраўды выдатная, у нашым краі не адзначалася як усенародны фэст з феерверкамі ды банкетамі. Наша грамадскасць абмежавалася сціплай прэзентацыяй, якая прайшла прыгожа і годна.

Спадарыня Рошчына, загадчыца аддзела рэдкай кнігі, запрасіла да ўдзелу ў імпрэзе знаных дзеячаў навукі і культуры: доктара У. Конана, выдаўца і пісьменніка Я. Лецку, кандыдата гістарычных навук, віцэ-прэзідэнта згуртавання татараў Беларусі спадара Канапацкага. Быў запрошаны шаноўны Ніл Гілевіч. Кожны з удзельнікаў выказваў праўдзівыя і небанальныя думкі. Мастак Мікола Цудзік адмыслова для імпрэзы прымеркаваў выставу сваіх твораў, якія сталіся аздобаю залы і надалі настрой, сцішаны і малітоўны.

Каб найлепш усвядоміць, што значыць сёння для нас з'яўленне такога выдання, варта ўспомніць гісторыю Біблії на Беларусі. Змястоўную інфармацыю па гэтым пытанні дае ў артыкуле "З гісторыі новабеларускіх перакладаў Біблії" спадар С. Шупа. Аўтар слушна заўважае: "Адным з паказчыкаў культурна-гістарычнае і духовае паўнацэннасці нацыі бясспрэчна можна лічыць наяўнасць перакладу на нацыянальную мову Святога Пісання. І мы, беларусы, у той меры можам лічыць сябе паўнацэнным хрысціянскім народам, у якой выкананая ў нас гэтая высокая задача". І далей у артыкуле наступныя звесткі: нам сёння ведамыя дзесяткі рукапісаў Евангеля і Псалтыра, створаных на нашай зямлі ў XI--XV стагоддзях. З друкаваных перакладаў найбольш даследаваныя выданні Францішка Скарыны і Васіля Цяпінскага. Аднаўляючы перарваную на некалькі стагоддзяў традыцыю перакладаў, у гэтай справе найбольш актыўна выявілі сябе беларусы-католікі. Першыя заклікі да перакладу і выдання Святога Пісання па-беларуску з'явіліся ў перыёдыцы ў 1913 годзе. Пратэстанцкі пастар Лукаш Дзекуць-Малей на пачатку 20-х гадоў перакладае Евангеллі, якія ў 1926--1930 гадах выходзяць асобнымі брашурамі ў баптысцкім выдавецтве "Компас" (Лодзь). Успамінаюцца ў артыкуле імёны славутых нашых дзеячаў -- Антона Луцкевіча, кс. Вінцэнта Гадлеўскага, кс. Пётры Татарыновіча, Янкі Станкевіча, Янкі Пятроўскага. Важным укладам у справу біблейскіх перакладаў сталася выдадзенае архіепіскапам Мікалаем, Першаіерархам Беларускае аўтакефальнае праваслаўнае царквы "Напрастольнае Святое Евангелле" (Таронта, 1988). Пераклады, што выходзілі выключна за межамі Бацькаўшчыны ў 1930--1980-я гады, друкаваліся і беларускай лацінкаю, і кірыліцай. Праца перакладчыкаў найчасцей была ахвярнаю справай асобных людзей, у якіх не было магчымасці абаперціся на грунтоўную навукова-багаслоўскую базу. Цяпер жа, заканчвае свой артыкул спадар Шупа, разам з сацыяльнымі і палітычнымі зменамі, з крызісам атэістычнай прапаганды і з ростам увагі Царквы і Касцёла да "беларускага пытання" адкрываюцца новыя перспектывы для далейшых даследаванняў Святога Пісання на Беларусі і пашырэння Божае праўды на нашай роднай мове. Артыкул гэты змешчаны ў чацвёртым нумары часопіса "Веснік Беларускага Экзархата" за 1990 год.

І вось прайшло пяць гадоў, і мы маем тры адметныя айчынныя выданні біблейскіх кніг, перакладзеных на мову беларусаў -- "Евангелле ад Мацвея", "Найвышэйшая песьня Саламонава" і "Новы Запавет. Псалтыр". Да ўсіх гэтых перакладаў спрычыніўся знаны майстра, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Васіль Сёмуха. У тым жа часопісе надрукаваныя крэда і некаторыя меркаванні перакладчыка адносна сваёй працы. Мушу шырока скарыстаць цытаты з тае прычыны, што прэзентацыя кнігі праходзіла без удзелу аўтара перакладу. Дык вось, аўтар адзначае: "Практычна ўсё, што мае дачыненне да духоўных тэкстаў, уся тэрміналогія існуюць у двух варыянтах -- праваслаўным і каталіцкім. Цэрквы робяць у гэтым вельмі выразнае размежаванне, а ў жывой народнай мове ўсё перамешана, падпарадкавана не духоўнаму, а душэўнаму ўпадабанню: вернікі беларусы, калі і належаць да розных хрысціянскіх канфесій, карыстаюцца арсеналам абедзвюх тэрміналогій. Але сёння мы працуем над перакладам для карыстання беларускамоўнага тэксту Новага Запавета ў Беларускай праваслаўнай царкве, і гэта патрабуе ад нас выразнага правядзення лініі праваслаўя ў мове беларускага перакладу..."

Васіль Сёмуха заакцэнтаваў увагу і на творчых праблемах: "...Царкоўны пераклад -- поўная процілегласць свецкаму. У ім самае галоўнае -- **СЭНС**. Таму пасля першай крытыкі Камісіі, зычлівай і зацікаўленай, я пэўны час быў у стане глыбокай расчараванасці і дэпрэсіўнай паняверкі. Але пасля, абдумаўшы ўсё тое, што было выказана на пасяджэннях, нешта прыняўшы, нешта не прыняўшы, але ўсё грунтоўна ацаніўшы, я цалкам перагледзеў ранейшую сістэму, на якой быў выхаваны як перакладчык свецкай літаратуры. Часовы крызіс быў пераадолены, і адкрыліся новыя для меня прынцыпы перакладу і падыходы да яго, раней вядомыя толькі чыста тэарэтычна". Далей аўтар канстатуе: "Нашага перакладу нецярпліва чакаюць пратэстанцкая і каталіцкая цэрквы Беларусі. Я магу толькі марыць і жадаць усёй душой, каб саборны пераклад Свяшчэннага Пісання на беларускую мову паспрыяў умацаванню адзінства і ўзаемаразумення хрысціянскіх Цэркваў Беларусі, яднанню ўсіх вернікаў нашай зямлі, добрай славе нашай роднай богаспадобнай мовы і росквіту духоўнай сілы нашага народу". Такімі марамі і спадзяваннямі быў прасякнуты аўтар перакладу пяць гадоў таму. І вось кніга выйшла ў свет. І гэта, бясспрэчна, падзея.

Але тут паўстаюць пытанні. Ці будзе яна запатрабаванай нашымі суайчыннікамі? Ці знойдзецца ёй месца ў паспалітай хаце, у школе, ва ўстанове? Хто яе будзе чытаць? Днямі, шукаючы бібліятэку ў Епархіі, запытаўся, дзе яна месціцца, у дзяжурнага, маладога, жвавага хлопца. Ён не зразумеў: "Что, что? Ах, вам библиотеку... Здесь скоро нужно будет посадить переводчика... Не называйте меня "спадар"... Пан, товарищ? Нет, лучше -- господин..." Знаёмая кабета роспачна скардзілася, што ў касцёле ў бальшыні выпадкаў пропаведзь гаворыцца па-польску. Спадарыня наўмысна час ад часу запытвае парафіянаў, пра што казаў ксёндз. І практычна ніхто не можа даць уцямнага адказу. "Але ж праз тое губляем вернікаў", -- скрушліва вохкала яна...

Падчас прэзентацыі з сумам заўважыў у захоўванні значнай часткі прысутных ветлівую абыякавасць. Мае суседкі ажывіліся толькі тады, калі мастак паведаміў, каменціруючы партрэт жонкі і ўнука, што дзядулем ён стаў у 33 гады... Гэта некаторыя з падобнага кшталту ўражанняў апошніх двух тыдняў.

Але кніга на роднай мове, перачакаўшы доўгія стагоддзі, усё ж такі выйшла на Беларусі. Клопат Богдана Онкава і Якуба Бабіча (фундатараў Скарыны) у нашым выпадку ўзялі на сябе Знешэканомбанк, Белпрамбудбанк, іншыя ўстановы і асобы. Значна паспрыяў выданню спадар Янка Запруднік, вядомы дзеяч беларушчыны на эміграцыі. Арыгінал-макет выкананы на настольна-выдавецкай сістэме спадара Юркі Рапэцкага з Канады. Аформіла кнігу мастачка Таццяна Лапіцкая. Выданне здзейснена з благаславення Найпачэснейшага Мікалая, архіепіскапа Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы.

Стрыманы аптымізм і надзею на тое, што Слова Божае ў роднай мове спатрэбіцца маім суайчыннікам, надае той факт, што першымі, хто адгукнуўся дапамогаю выдаўцам, былі простыя жанчыны са Свіслачы, сёстры Анісімавы, якія даслалі па дзесяць тысячаў рублёў. Спадзяюся, што тых, хто чакае беларускую Біблію, больш за лічбу 5 700, колькасць экземпляраў тыражу.

А цяпер вернемся да фрагмента з Новага Запавета, якім пачаўся артыкул. Усемагутны Творца адкрыў дар апосталам размаўляць іншымі мовамі, каб несці па свеце Добрую Вестку. Усемагутны Творца захаваў людзям розныя мовы, але ж не прывёў усіх да адзінай. Клопат людзей захаваць дадзены Богам адметны "сродак камунікацыі". Абыякавасць і пагарда бальшыні грамадзян Беларусі, беларусаў і небеларусаў да Божага дару, нашага слова, відавочныя.

Галоўная кніга хрысціянаў, якая выйшла цяпер і ў нас, не згубіцца ў моры падобных выданняў. На яе вокладцы -- выява адзінага ў свеце крыжа святой Ефрасінні Полацкай, нябёснай апякункі нашай Айчыны. Хацеў бы толькі, каб у наступных выпусках выдаўцы прадугледзелі лясэ -- стужачку для закладкі памятных старонак. Так зручней чытаць.

Зьміцер КАЛІСТРА.





НА ЗДЫМКАХ: прэзентацыя "Новага запавету" ў Нацыянальнай бібліятэцы.

Фота Віктара СТАВЕРА.

ХРОНІКА БЕЛАРУСАЗНАЎЧАГА ЖЫЦЦЯ

У ПАРЫЖСКАЙ "КУЛЬТУРЫ"

У дзевятым нумары польскага штомесячніка "Культура", які выдаецца ў Парыжы ўраджэнцам Мінска Ежы Гедройцем, змешчана вялікае інтэрв'ю беларускага пісьменніка Сяргея Дубаўца з загадчыкам кафедры славянскай філалогіі Вільнюскага універсітэта вядомым беларусістам (у 1988 годзе разам з прафесарам Э. Смулковай ён выдаў у Варшаве кніжку "Фанетыка і фаналогія беларускай мовы з элементамі агульнай фанетыкі і фаналогіі") Валерыем Чакмонасам (Чэкманам) пад назвай "Беларусы хочуць, каб было як раней". Па прапанове інстытута паліталогіі Жэнеўскага універсітэта літоўскі мовазнавец (раней ён нейкі час працаваў у Мінску) цяпер займаецца праектам "Фармаванне новага геапалітычнага арэала ў цэнтральнай Еўропе". Збіраючы анкетныя звесткі, ён аб'ездзіў амаль усю Літву і Беларусь, апытаў звыш 350 чалавек.

Вывады, да якіх прыйшоў прафесар Чэкман у час апытання, не на карысць беларусаў. Расчараваныя і знявераныя ў жыцці, яны менш ахвотна і шчыра адказвалі на пытанні ("мае думкі нікому непатрэбныя"), чым літоўцы. Вучоны гэта тлумачыць "пралетарызацыяй свядомасці, культуры", люмпенпралетарыяцкай псіхалогіяй людзей, а таксама тым, што ў Беларусі "засталася некранутай старая наменклатура" (выключэнне часткова складае Гродна) -- яе прадстаўнікі памянялі толькі становішча, але ментальнасць іх засталася ранейшай, савецкай. Адсюль -- імкненне да рэстаўрацыі ўсяго, што было. Яно асабліва праяўляецца ў ветэранаў і значна менш -- у людзей ад 20 да 30 гадоў.

Цікавыя разважанні вучонага наконт рэлігійных і нацыянальных пачуццяў. На яго думку, "ні праваслаўе, ні тым больш каталіцызм не могуць прэтэндаваць, каб стаць агульнанацыянальнай рэлігіяй". 80 працэнтаў апытаных адказалі, што веравызнанне не мае для іх асаблівага значэння. Што ж датычыцца нацыянальнай свядомасці, дык вучоны не сустрэў сем'яў, дзе "беларуская мова была б хатняй мовай". Людзі ўсё больш гавораць на "трасянцы", жахлівай у фанетычных і лексічных адносінах. Большасць жыхароў Беларусі абапіраецца не на сваю, а на іншую культуру і гісторыю. Таму беларускае адраджэнне не набыло агульны характар -- "яно засталося незразумелым, не выклікала рэакцыі". Прафесар Чэкман вінаваціць у гэтым і друк: адраджэнскія выданні выходзяць толькі па-беларуску, а трэба было б, каб былі і рускія аналагі.

У інтэрв'ю закранаюцца таксама адносіны беларусаў да іншых народаў (з блізкага замежжа найбольш станоўча ацэньваюцца рускія, з далёкага -- немцы), нацыянальная "самахарактарыстыка" ("працавітыя, сціплыя, гасцінныя").

На падставе беларускага і літоўскага матэрыялу В. Чэкман рыхтуе манаграфію.

ПЕРАДАДЗЕНЫ ТВОРЫ ГАЛІНЫ РУСАК


Паводле дамоўленасці паміж Мастацкім музеем Беларусі і Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны ў музейную экспазіцыю "Беларусы ў свеце", якая дзейнічае ў цэнтры, перададзены два палотны Галіны Русак -- беларускай мастачкі, якая жыве і працуе ў штаце Нью-Джэрсі (ЗША). Гэта вядомыя "Васілёк. Слуцкі пояс" і "Ой ты, Нёман-рака".

У адказ у Мастацкі музей Беларусі быў перададзены алейны труменны партрэт невядомага вяльможы XVIII стагоддзя работы невядомага мастака. Гэтую мініяцюру на меднай блясе вазіў з сабой беларускі пісьменнік-эмігрант Юрка Віцьбіч (магчыма, на партрэце -- яго продак). Пасля смерці пісьменніка гэтую рэдкасць вы ратаваў ад знішчэння дырэктар Беларускага інстытута навукі і мастацтва (ЗША) Вітаўт Кіпель, які і перадаў сваю знаходку ў экспазіцыю "Беларусы ў свеце". Цяпер твор экспануецца ў Мастацкім музеі як адзіны там труменны партрэт.

Лена КАЗЛОВА,
рэферэнт МАБ.

Сяргей ПЯСЕЦКІ

"КАХАНАК ВЯЛІКАЙ МЯДЗВЕДЗІЦЫ"



Тады пагранічную ахову з самой мяжы пасунулі на некалькі дзесяткаў метраў назад і там парабілі сьцежкі для варты. Гэта адначасова зрабілі палякі і бальшавікі. Умацоўвалася граніца і засекамі з калючага дроту, які ня раз цягнуўся на досыць значнай прасторы.

Хадзіць за граніцу было штораз цяжэй. Пагранічная ахова працавала нервова, інтэнсіўна. Скрозь былі засады. У прыдатных для пераходу месцах нам перашкаджалі калючыя драты, і, каб праз іх перабрацца, мы вымушаны былі хадзіць з матамі ці жэрдкамі. Здаралася кусаць дрот нажніцамі, аднак рабілі гэта ў выключных выпадках, не жадаючы беспадстаўна злаваць зялёнак і паказваць нашы любімыя месцы перапраў праз граніцу.

Пад канец жніўня я сёмы раз пайшоў з групай Юрліна. Вырушылі ў дарогу рана. Ночы падаўжэлі, таму хацелі да раніцы дабрацца да мяліны. Група была ў камплекце: Юрлін, Лорд, я, Камета, Шчур, Соня, Ванька Бальшавік, Алігант, Смактун, Юбіна і Гірш Кнот. Ношкі мелі па 40 фунтаў.

Непадалёку ад граніцы Лорд і Камета выцягнулі з густога хмызняку доўгі -- некалькі метраў -- мат. Быў ён сплецены з саломы і лазы, моцна зашыты па берагах аборкамі. Лорд нёс дзьве доўгія жэрдкі, а Камета валок скручаны, нібы ходнік, мат.

Вельмі ціха ідучы лесам, дабраліся да граніцы. Ноч была цёмная. Неба замглёнае. Прыслухоўваючыся, доўга стаялі на ўскрайку лесу і затым выйшлі на пагранічную паласу, наблізіліся да засекі. Прывязаўшы да аднаго канца мата жэрдкі, паднялі іх угару і разам з матам паклалі гэты "памост" на драты. З нашага боку таксама прывязалі да жэрдак канцы мата.

Тады пачалася пераправа. Перамытнікі па чарзе залазілі наверх і, трымаючыся рукамі за жэрдкі, на каленях перапаўзалі на другі бок засекі. Гэта адбывалася хутка, бязгучна. Калі ж усе апынуліся на тым баку, пачалі падымаць мат угару. Потым паадвязвалі жэрдкі. Мат скруцілі і падаліся ў лясны гушчар. Жэрдкі і мат прыхавалі ў густым маліньніку, на значнай адлегласьці ад мяжы. На зваротным шляху меркавалі забраць іх з сабой.

Шчасьліва перайшлі лес паблізу ад граніцы і рэчку на другой лініі. У нейкім месцы Юрлін, каб скараціць шлях, пакрочыў вузкай сьцежкай праз лес. Ноч была цёплая і ціхая. Прасоўваліся досыць хутка, а паколькі ў лесе было зусім цёмна, часта натыкаліся на плечы пярэдніх сябраў.

Лес рабіўся ўсё радзейшым. Хутка выбраліся на вузкі лужок, што клінам урэзваўся паміж двума крыламі лесу. Пасярэдзіне лужка бег ручай. Далей Юрлін павёў нас уздоўж яго берага. Лес застаўся ў цемры. Зараз было відней, і я мог адрозніваць мясцовасьць на некалькі крокаў ад сябе. Лужок шырэў усё больш.

У нейкім месцы пачулі на дарозе звон жалеза. Юрлін спыніўся. Уся група замерла. Звон паўтарыўся некалькі разоў. Зразумеў, што гэта звіняць жалезныя путы на нагах коней, якія пасьвіліся ў начным.

У вузейшым месцы Юрлін пераскочыў на другі бок ручая і, адыходзячы ад яго, трапіў на дрыгву. Але хутка зямля пачала правальвацца пад нагамі, і мы вымушаны былі вяртацца на ранейшае месца.

Калі зноў спыніліся, прыслухоўваючыся, на беразе ручая, я выразна пачуў крокі людзей, якія сьпяшаліся да нас. Юрлін амаль бягом кінуўся ўправа. Тады сьпераду бліс396нуў ліхтарык. У яго сьвятле ўбачыў абрысы пярэдніх сябраў. Юрлін павярнуў на дрыгву. У той жа момант збоку прагучаў вокліч:

-- Стой! Стой! Стой... "Ребята", заходзьце ад лесу! Жыва!

Блiснула яшчэ некалькі ліхтарыкаў. Разнёсься тупат ног, крыкі, кленічы.

-- Стой! Стой!..

Працяг.
Пачатак у №№ 29—47.

-- Кажу, стаць, халера, бо страляем!

"Напэўна, не маюць карабінаў пры сабе, -- падумаў я, -- даўно б стралялі!"

Адступаем усё далей у дрыгву. Ногі глыбока правальваліся ў балота, а ззаду пагоня ўсё набліжалася да нас.

Шчур бег каля мяне і праклінаў:

-- Гэта жлабы! Гэта хамы! Гэта дрань!

Я ведаў, што не пасьпеем уцячы. У нейкі момант адскочыў убок з дарогі. Шчур крыкнуў:

-- Ты дзе?

Не адказаў яму. Хвіліну стаяў адзін, пасьля прыкмеціў нейкія цьмяныя сілуэты, што набліжаліся да мяне. Асьвяціў іх ліхтарыкам і адначасова -- стрэл за стрэлам пачаў паліць у іх з нагана. Убачыў, што людзі, якія гналіся за намі, пачалі ўцякаць. Хутка выкінуў гільзы з барабана і зноў зар[illegible] рэвальвер. Збоку пачу[illegible]лёгкія крокі. Ледзь не стрэліў туды, аднак кароткі бліск майго ліхтарыка вырваў з цемры постаць Шчура.

-- Гэта мурова! -- вы[illegible]ў перамытнік.

-- Хто гэта быў? -- запытаўся яго.

-- Альбо масалкі пасьвілі коней і ня мелі карабінаў, альбо гады на начлезе... Гэта найхутчэй! -- дадаў за хвіліну. -- Але ты клёва іх пачаставаў. Яны нас дагналі б! Ведаюць тут кожны куст і ня маюць ношак... Але добра ім!.. Добра!

-- Пойдзем за нашымі? -- запытаўся я сябра.

Шчур зьлёгку сьвіснуў.

-- За нашымі?.. Дзе ты іх зараз знойдзеш?.. Вяртаемся да мястэчка!.. А тавар ужо наш і без агранды! -- дадаў праз хвіліну і ціха засьмяяўся.

Павольна пакрочылі па дрыгве ў бок ручая, а потым яго берагам дабраліся да лесу.

Яшчэ перад апоўначчу прыйшлі ў мястэчка.

-- Дзе ты прадасі тавар? -- запытаўся ў Шчура.

Перамытнік чмыхнуў носам.

-- Я табе 100 фураў тавару прадам. Толькі давай!

-- Можа, і мой прадасі?

-- Добра. Толькі памажы паднесьці дахаты, на раніцу будзем мець грошы.

Непадалёку ад кватэры Шчура разьвіталіся. Сябра на хвіліну затрымаў маю даланю.

-- Ты гэта... не кажы хлопцам, што крапіў з капыта тых гадаў... Будуць баяцца з табой хадзіць!

-- Добра.

-- А пра тавар кажы, што кінуў на балоце, бо сам ледзь вылез. Разумееш?.. Каб не падумалі, што гэта агранда!

-- Добра.

-- Увечары прыйду да цябе, -- прамовіў Шчур і зь дзьвюма ношкамі за плячыма зьнік у глыбіні падворка, а я падаўся дахаты.

У такі спосаб упершыню выпрабаваў свой рэвальвер.

9

На пагранiччы была адна незвычайная група. Яе называлі "дзікай", хлопцаў, што да яе належалі -- "дзікімі", ці таксама вар'ятамі. "Дзікія" амаль не захоўвалі жадных сродкаў бясьпекі і праз граніцу хадзіл[illegible] "ўра"! Часта пападаліся.

шыністы ў іх мяняліся праз некалькі месяцаў. Аднак дзіўная рэч -- гэтая вар'яцкая група працавала трэці год. Сто разоў разьбітая, сто разоў зьбіралася і далей трэспа па начах граніцай і пагранiччам... Ствараліся і зьнікалі шматлікія групы, "клаліся" найлепшыя, рафінаваныя машыністы, а гэтыя д'яблы працавалі без перапынку. Наладжвалі гранды і праіснавалі гады, праўда, заўсёды ў іншым складзе.

У "дзікіх" знаходзілі сабе месца тыя, каго не прымусіш хадзіць з рэгулярнай групай, і тыя, хто з перакананьняў не хацеў падпарадкоўвацца абавязковым для ўсёй групы ўмовам, правілам дысцыпліны, і тыя, хто хацеў час ад часу зарабіць крыху грошай, а таксама і тыя, хто любіў авантуры, хто не турбаваўся пра асабістую бясьпеку і сталыя заробкі.

Назаўтра, пасьля нашай спрэчкі зь Юрліным, Шчур пазнаёміў мяне з машыністам "дзікіх" -- Войцехам Анёлам. Мы не жадалі губляць ні аднаго тыдня залатога сезона і ведалі, што "дзікія" ня будуць нас распытваць, ці ходзім са зброяй, ці безь яе. Анёла засталі ў хаце. Ён сядзеў у вялікаватай дзіцячай калысцы на драўляных палазах, што стаяла пасярод пакоя, і заўзята гушкаўся, выкідваючы ўзад і ўперад ногі. Да ніжняй вусны прыляпілася самакрутка, скручаная з каляндарнага лістка. На стале ў коўдрачцы ляжаў выняты з калыскі зусім голы хлопчык. Дзіўная справа, але ён ня плакаў: магчыма, што быў заняты засоўваннем пальцаў левай нагі ў рот.

-- Здароў, Анёл! -- крыкнуў Шчур, заходзячы са мной у хату.

Анёл, прыплюшчыўшы левае вока, сплюнуў у кут.

-- Ну і што з таго? -- сказаў.

-- Што ў цябе чуваць? -- працягваў далей Шчур.

-- Інтарэс у руху, а рух у інтарэсе! -- адказаў, не перастаючы гушкацца, Анёл і, напэўна, гэта маючы на ўвазе.

-- Хочам хадзіць з вамі за граніцу, -- прамовіў Шчур.

-- Можаце... Не даю вам, ці што?.. Анёльскі інтарэс.

-- То калі ідзяце?

-- Сёньня.

-- Адкуль?

-- Халера яго ведае, адкуль!

-- Дык як жа вас знайсьці?

-- Халера яго ведае як!

Шчур выцягнуў з кішэні пляшку гарэлкі.

-- То замочым інтарэс.

Анёл згодна кашлянуў і выпусьціў пад столь густы клубок дыму. Шчур падаў яму пляшку. Анёл лёгкім рухам далані выбіў з бутэлькі корак і, гушкаючыся, зірнуў на мяне.

-- Гэты таксама да моці?

-- Так... з храпай...

-- Не, я не хачу, -- адказаў.

-- Дык і добра, -- выгукнуў Анёл.

Потым пазначыў пазногцем на пляшцы палавіну яе ёмкасьці, закінуў назад галаву і, працягваючы гушкацца, пачаў піць. Гарэлка булькала ў яго горле: кадык скакаў угару. Анёл, не зірнуўшы на пляшку, перастаў піць. Зноў паглядзеў на шкло бутэлькі: выпіў як адмераў -- па край пазногця. Пасьля перадаў пляшку Шчуру, [illegible] і выхлебтаў сваю долю, а по[illegible] запытаў Анёла:

-- Дык дзе мы сустракаемся?

-- Пад вечар... Каля Кентаўра... як анёлкі.

-- Клёва! Заставайся з Богам!

-- Ідзіце зь д'яблам.

Калі выйшлі ад Анёла, я сказаў Шчуру:

-- Гэта ж вар'ят!

-- Мудры вар'ят! -- адказаў сябра.

Увечары падаліся ў напрамку хаты купца Кентаўра, якога ў мястэчку таксама лічылі вар'ятам. Пра гэта сьведчыла шмат акалічнасьцяў, і найперш тое, што даваў тавар "дзікім". Надараліся яму лепшыя "салідныя" групы, аднак ён меў да "дзікіх" нейкі сантымент і даваў ім тавар ужо трэці год... "Дзікія" рабілі яму агранду, ён міргаў вокам -- "ведаю пра гэта!.." Зноў агранда. Ён зноў міргаў вокам і запрашаў некалькі вар'ятаў да сябе на пэйсахоўку. Пасьля казаў ім:

-- Ну, хл[illegible]ы, калі цяпер здарыцца пр[illegible], дык наступным разам за граніцу панясяце салому... І я з вамі!

Гэтым браў "дзікіх" за сэрца, і тыя чыста перакідвалі праз граніцу 5-[illegible]груп. Кентаўр падкоўваўся[illegible]кладаў фабрыку мыла ў Ві[illegible], фабрыку атраманту ў Лідзе, фабрыку шакаладу ў Гародні. Фабрыкі былі ягонай маніяй. Акрамя мянушкі -- Кентаўр (фірмовы знак яго шматлікіх фабрык), была яшчэ адна -- Фабрыкант... Звычайна фабрыкі атрымлівалі па лбе, "дзікія", прыкмеціўшы, што купец падкуўся, бо закладвае новыя фабрыкі, пачыналі рабіць яму агранды, і Кентаўр занепадаў. Ён зноў запрашаў да сябе сваіх вар'ятаў на пэйсахоўку, зноў прапаноўваў ім насіць за граніцу салому і зноў адкуваўся. І так па кругу -- трэці год.

Непадалёку ад хаты Кентаўра сноўдаліся групы хлопцаў. Прахаджвалі ўдвух, утрох, па некалькі адразу. Зь некаторымі перамытнікамі Шчур вітаўся.

-- Дзе Анёл? -- запытаўся ў аднаго зь іх.

-- Ён разам з Сумам у Кентаўра сядзіць.

-- Пэйсахоўку п'юць, -- дадаў нехта збоку.

Мы шпацыравалі далей уздоўж шэрагу крамак і жыльлёвых будынкаў. Неўзабаве з брамы гандляра выехаў вялізны воз. На ім сядзелі -- Анёл, Сум і жыд-суправаджаты -- Бэрка Ступа. За фурмана -- Кентаўраў парабак -- Кастусь Кульгавы. Анёл, паклікаўшы да сябе аднаго з хлопцаў, прамовіў некалькі слоў. Той кіўнуў галавой. Воз паехаў наперад і хутка зьнік за паваротка́й.

Хлопцы купкамі, па некалькі чалавек, накіраваліся на Слабаду, а адтуль пакрочылі ў напрамку Душкава.

Недалёка за Выганічамі, зь лесу, насупраць першай групы перамытнікаў, выйшаў Анёл. Разам пачакалі астатніх хлопцаў, а потым падаліся ў глыб лесу.

У адным месцы, каля вялікай кучы ламачча, дзе стаялі Сум і Бэрка Ступа, усе затрымаліся. Анёл пачаў выцягваць з-пад гальля ношкі. Нядбала кідаў на зямлю, лічачы ўголас: раз, два, тры... Адлічыў васемнаццаць і спыніўся. Прамовіў да нас:

-- Бярыце ношкі! Па-анёльску...

Выходзіць у дарогу было зарана. Хлопцы рассыпаліся па лесе і выразалі сабе тоўстыя кіі. "Дзікія" рабілі так заўжды -- у дарогу ішлі з каламі, якімі неаднойчы гналі і білі "падкіх" на лёгкую здабычу сялян, што заступалі ім шлях. Я са Шчурам таксама выразаў дзьве ёмкія палкі. Пасьля хлопцы сабраліся каля ламачча і, лежачы на імху, курылі папяросы.

Нас было дзевятнаццаць. Набліжаўся вечар. У лесе ўсё больш цямнела. Анёл, падышоўшы да гальля, асцярожна выцягнуў адтуль мяшок. Пачаў вымаць і адкідваць у розныя бакі на мох пляшкі сьпірытусу. Адлічыў дзевяць, прамовіў:

-- Па адной на двух! Як анёлкі!..

Хлопцы адразу пачалі піць, Анёл жа рупліва завязаў мяшок і аддаў яго, як дадатковую ношку, Суму.

-- Панясеш ты!.. Толькі не пабі і не набярыся!

Штосьці мармычучы, Сум узяў мяшок.

Хлопцы пілі. Некаторыя захлыналіся сьпіртам і адкашліваліся. Разьляцеліся вясёлыя галасы, і выбухнуў сьмех.

Зьмяркалася.

-- Ну, вар'яты, бярыце ношкі! -- загадаў Анёл.

Усе падняліся зь месцаў, пачалі закідваць рамяні ношак. Ношкі былі цяжкія. Мы несьлі скуры на падэшвы. Тавар быў танны, аднак даваў ад 150 да 300 працэнтаў прыбытку.

-- Ну, шах!.. І ані мур-мур!.. -- прамовіў да хлопцаў анёл, рухаючыся ў дарогу.

Нехта ў адказ заліўся вясёлым сьмехам, іншыя засьвісьцелі. Група пакрочыла наперад. Хлопцы не захоўвалі ні цішыні, ні дыстанцыі. Ламалі кусты, трашчалі гальлём, кашлялі, кляліся, сьмяяліся і расьцягнуліся на чвэрць кіламетра. Анёл некалькі разоў прыпыняўся, трос кулаком, але безвынікова і толькі выклікаў сьмех. Тады Анёл так хутка рвануў наперад, як быццам хацеў уцячы ад нас. Мы вымушаны былі подбегам даганяць яго.

Я са Шчурам ішоў пасярэдзіне групы. Напачатку нас зьдзіўлялі такія паводзіны перамытнікаў непадалёку ад граніцы, а потым мне таксама зрабілася весела. Сьпірт разагрэў, а недысцыплінаваны марш хлопцаў пазбаўляў ад думак пра небясьпеку.

За крокаў дзесяць перада мною хтосьці зацягнуў на матыў "Яблычка":

Што я бачу, што я чую?
Троцкі лезе на страху,
І так крычыць ён народу:
"Фігу вам -- а не свабоду!"

-- Здорава.

-- Рубай далей!

Разьнесьліся галасы перамытнікаў, і Валюсь Шумпанс (гэта ён сьпяваў) прапітым галасам выводзіў далей строфы "Яблычка".

Раптоўна група затрымалася. Да Шумпанса падбег Анёл.

-- Замкні морду, жлоб!

-- Ну, бо што?

-- Бо тое!.. Бо бальшавікам у лапы нас завядзеш!.. Як анёлкаў!.. З понтам рыкаеш, халера! Зараз граніца!.. Масалкі дарогу заступяць!..

Анёл вырушыў наперад. Ідзём хутка. Ужо ніхто не сьпявае, але без таго робім шмат галасу!

Праз нейкі час трапляем на пагранічную паласу. Таксама шпарка, зусім не прыслухоўваючыся, крочым далей. Яшчэ досыць відна. Можна адрозьніваць мясцовасьць на адлегласьці ў некалькі дзесяткаў крокаў. Перад намі бачу высокую і шырокую засеку калючага дроту. Анёл зварочвае ўлева і крочыць па паласе. Мінаем пагранічныя слупы. Хлопцы па ходу ляпаюць у іх даланямі альбо канцамі палак па насыпах.

Анёл падаецца ўправа і прыпыняецца каля засекі. Падыходзім да яго.

-- Мігдаль, нажніцы! -- кажа Анёл.

Кастусь Мігдаль вымае з-за паса нажніцы, і Анёл пачынае хутка перакусваць дрот, які звініць пад вострымі нажніцамі і абвальваецца па баках. Работа спорыцца. Хлопцы адгортваюць абвіслыя драты.

МІЖВАЕННАЯ БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ: ЗНЕШНІ АСПЕКТ

Заканчэнне. Пачатак у № 47.

Шмат негатыўнага матэрыялу было выяўлена ў 1928 годзе, калі інспекцыя наркамата асветы правярала на месцах ход стварэння беларускіх школ.

(З мэтай дасягнення хутчэйшага эфекту НКА РСФСР практыкаваў арганізацыю канферэнцый-нарад па пытаннях беларусізацыі. І трэба прызнаць, што пэўныя зрухі, хаця і з вялікімі цяжкасцямі, усё ж праявіліся тут. У 1930 годзе працэнт беларусізацыі школ першай ступені Заходняй вобласці склаў 36. У наступным годзе ў школах сялянскай моладзі працавала 29 беларускіх груп з ахопам 1 205 навучэнцаў, мелася 147 беларускіх камплектаў у пачатковых школах, у якіх вучылася 1 058 чалавек. З агульнай колькасці створаных для беларускіх дзяцей школ больш чым у 67 працэнтаў навучанне вялося на беларускай мове. Апошнім часам тут значна вырас лік беларускіх школ павышанага тыпу. З 1930 года распачалі працу Руднянскі беларускі педагагічны тэхнікум з кантынгентам навучэнцаў 177 чалавек і беларускі рабфак у Смаленску, з восені 1932 года планавалася адкрыццё беларускага аддзялення пры Смаленскім педагагічным тэхнікуме. У гэтых адносінах Заходнюю вобласць называлі "перадавым участкам на фронце асветы беларусаў у РСФСР". З мэтай паляпшэння культурнага абслугоўвання беларусаў на іх нацыянальнай мове было створана 20 хатаў-чытальняў і 7 бібліятэк. Такога роду ўстановы асветы і культуры закладваліся пры актыўнай падтрымцы мясцовага беларускага насельніцтва. Так, "беларуская Любавіцкая школа сабрала сярод сялян 360 подпісаў за перадачу царквы пад школу і дамаглася адпаведнай рэзалюцыі ад двух калгасаў".

На беларускіх землях Заходняй вобласці РСФСР найбольш цяжкасцяў з пераводам культурна-асветных устаноў на ўласны нацыянальны грунт *зведвалася* з-за адсутнасці добра падрыхтаваных для гэтага кадраў, патрэбнай літаратуры, асабліва падручнікаў. Але былі і перашкоды іншага плана. Маюцца факты, што культурна-асветніцкую работу сярод беларусаў наўмысна зрывалі мясцовыя органы ўлады вобласці. Яны адкрылі ў 1930 годзе ў Руднянскім раёне беларускі педтэхнікум толькі пасля таго, як "газета "За коммунистическое просвещение" ўскрыла шавіністычны характар усёй валакіты" з яго арганізацыяй.

Вялікія надзеі на ажыўленне беларускасці ўскладаліся на створаны ў другой палове 20-х гадоў Цэнтральны беларускі клуб у Маскве. У некаторыя гады ў яго ўваходзіла да 600 чалавек, сярод якіх пераважалі рабочыя. Значная колькасць сяброў клуба -- гэта палітэмігранты з Заходняй Беларусі.

Рэха беларусізацыі паралельна хутка дакацілася да шырокіх прастораў Сібіры і Далёкага Усходу, дзе ўжо не першыя дзесяцігоддзі жылі нашыя землякі. Паведаць апошнім, што рабілася на іх радзіме па лініі беларусізацыі, маглі і тыя выхадцы з нашай рэспублікі, якія ехалі ў той час асвойваць вольныя землі гэтых рэгіёнаў РСФСР. Такіх людзей штогод прыбывала нямала з Беларусі. У 1925 -- 1926 гадах ад нас ва ўсходнія раёны СССР выехала 12,7 тысячы чалавек, у 1926 -- 1927 гадах -- 24,8 тысячы, з іх у Сібір і на Далёкі Усход адпаведна 76,7 і 95,4 працэнта.

Усесаюзны перапіс насельніцтва 1926 года зафіксаваў, што тады ў Сібіры пражывала 320 тысяч беларусаў. Пазней іх колькасць яшчэ больш вырасла. Да яе дадаліся і тыя, хто незаслужана панёс пакаранне за ўдзел у выдуманым ідэалагічнымі службамі КП(б)Б нацдэмаўскім руху. Сярод іх знаходзіўся і наш этнограф, мовазнавец і літаратуразнавец Мікалай Каспяровіч (1900 -- 1945). Сібір ён наведваў яшчэ і да высылкі, бо цікавіўся там жыццём беларускіх перасяленцаў. У апошнія гады знаходжання на Беларусі (1926--1930) М.Каспяровіч працаваў навуковым сакратаром Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інбелкульце, затым АН БССР. Ён аўтар прац: "Беларуская архітэктура", "Беларуска-расійскі слоўнічак" (абедзве выйшлі з друку ў 1925 годзе), "Беларуская навука да Кастрычніка і пасля яго", "Віцебскі краёвы слоўнік" (абедзве -- 1927 год), "Краязнаўства" (1929).

Зразумела, М.Каспяровіч, апантаны нацыянальнай ідэяй, трапіўшы ў якасці ссыльнага ў далёкі Сібірскі край, не мог адысці ад беларускай справы, тым больш, што ў гэтым у яго ўжо меўся добры зачын. Пасля грунтоўнага даследавання культуры і быту тамтэйшых беларусаў яшчэ ў папярэднія гады ён выступіў на старонках вельмі папулярнага ў той час у СССР друкаванага органа ЦК саюза работнікаў асветы СССР "Просвещение национальностей" (1930, N 4--5) з цікавым і змястоўным артыкулам "Вопросы культурного обслуживания сибирских белорусов". Ён прыйшоў да праўдзівай высновы, што на даным шляху існуе "цэлы шэраг перашкодаў, у значнай меры абумоўленых характарам спадчыны мінулага", калі на беларусаў прынята было глядзець, як на рускіх. Наш зямляк выявіў шэраг неабвержных фактаў, што сярод некаторых работнікаў са[illegible]іх органаў народнай аду[illegible]і Сібіры бытуе погляд, у адпаведнасці з якім і ў нацыянальных школах трэба вучыць беларускіх дзяцей толькі на рускай мове і ўсяляк змагацца супраць [illegible]учэння ў такіх навучальных [illegible]новах іх роднай мовы. М.[illegible]аспяровіч крытыкаваў загадчыка краявога аддзела народнай адукацыі, што ён у сваіх выступленнях у друку ніколі не гаворыць пра патрэбы беларусаў. Асаблівы ж гнеў у нашага ссыльнага вучонага выклікала выступленне на адной з нацыянальных нарад, што праходзіла ў чэрвені 1927 года, старажыла-татарына, які з выглядам "прыват-дацэнта" з "Северо-Западного края" заяўляў, што "сярод беларусаў і ўкраінцаў не варта весці нацыянальную работу, таму што яны "рускія". Прадстаўнік ад украінцаў выступіў супроць такога хлуслівага сцвярджэння, а ад беларусаў -- прамаўчаў.

За час асабістых наведванняў у 1929 годзе сібірскіх цэнтральных і мясцовых устаноў М. Каспяровіч пераканаўся, што тут практычна не вядзецца аніякая культурна-асветніцкая работа сярод беларусаў на іх нацыянальнай мове. Ён выказаў сумненні адносна зместу атрыманай ад загадчыка мясцовага Істпарта даведкі, нібыта на беларускае аддзяленне савецка-партыйнай школы акругі не прыслалі 10 чалавек толькі таму, што ўсе беларусы размаўляюць па-руску. Зусім іншую інфармацыю ўдалося атрымаць ад Іркуцкай і Новасібірскай акружных інспектур народнай адукацыі, з якой вынікала "поўная адсутнасць практычнай увагі з боку паасобных работнікаў па народнай адукацыі да культурна-нацыянальнага абслугоўвання беларусаў". А вось які несуцяшальны адказ на пытанне аб арганізацыі культурнага абслугоўвання беларусаў атрыманы М.Каспяровічам у Сібірскім краявым аддзеле народнай адукацыі: "Адчуваем, што дзесьці штосьці робіцца, але дзе і што, -- не ведаем".

Нашага земляка заканамерна здзівіў разнабой у статыстыцы аб сетцы беларускіх школ у Сібіры, у чым вінаватыя самі органы народнай адукацыі, выводзячы даны паказчык у залежнасці ад палітычнай сітуацыі ці поглядаў той ці іншай кіруючай асобы на нацыянальнае пытанне. Сустракаліся такія даныя: у 1925/26 навучальным годзе было 6 беларускіх школ, а праз год -- 65. Фактычна ж па мове навучання яны былі рускія. У 1927 годзе на 107 218 беларусаў мелася 10 пачатковых школ, у чым таксама сумняваўся М.Каспяровіч, лічачы іх рускімі.

З прычыны адсутнасці неабходнай колькасці беларускіх школ дзеці-беларусы наведвалі самыя розныя па мове навучання ўстановы. Паводле праведзенага ў снежні 1926 года абследавання, іх у рускіх школах абучалася 2 768 чалавек, ва ўкраінскіх -- 3, у беларускіх -- 98, руска-ўкраінскіх -- 31, руска-беларускіх -- 46, руска-латышскіх -- 74. У школах-сямігодках з выкладаннем на рускай мове навучалася 406 беларусаў. М.Каспяровіч зусім не падзяляў пазіцыю органаў народнай асветы Сібірскага краю, якія абмяжоўваліся ўвядзеннем толькі пачатковай адукацыі на беларускай мове, бо гэта, пісаў ён, "тармозіць справу падрыхтоўкі кадраў і стварае для беларускага насельніцтва тупік пачатковай школы, з якога няма куды выйсці". У школах павышанага тыпу і ў вышэйшых школах Сібірскага краю (зразумела, рускамоўных) у 1927 годзе навучалася толькі 137 беларусаў. У наступным годзе іх прынята ў вышэйшыя школы толькі 25 чалавек, з чаго аўтар заключаў: "Такая нязначная колькасць беларусаў у вышэйшых школах сведчыць аб малой увазе да падрыхтоўкі кадраў для абслугоўвання беларускага насельніцтва краю -- кадраў, якія б будавалі сваю працу з улікам моўных і нацыянальна-бытавых варункаў, асаблівасцяў і г.д.".

Вынікам такой, можна сказаць, традыцыйнай перавагі рускай мовы ў рабоце ўсіх тыпаў навучальных устаноў стала тое, што ў 1928 годзе з 328 320 беларусаў Сібірскага краю пісьменных на рускай мове было 24,8 працэнта, на беларускай -- толькі 1,2 працэнта.

Становішчам беларусаў Сібіры цікавіліся і саюзныя органы ўлады, што вынікае з пастановы ЦВК СССР ад 9 снежня 1929 года. У ёй Сібірскі крайвыканком абавязваўся "закончыць выдзяленне і афармленне нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у мясцовасцях з кампактным насельніцтвам нацменшасцяў, у прыватнасці ўкраінскіх і беларускіх...

...Прапанаваць ураду РСФСР узмацніць падрыхтоўку кадраў для працы сярод украінскага і беларускага насельніцтва, а Сібірскаму краявому выканаўчаму камітэту ўлічыць наяўнасць у краі ўкраінскіх і беларускіх работнікаў і спецыялістаў для выкарыстання іх у раёнах, населеных адпаведнымі нацменшасцямі".

У шэрагу месцаў савецкія органы, аддзелы народнай адукацыі з усёй сур'ёзнасцю паставіліся да выканання высунутых у разглядаемай пастанове задач і дасягнулі пэўнага поспеху. Калі ў 1930 годзе ў цэлым па Заходнесібірскім краі была толькі адна беларуская школа павышанага тыпу, дык праз год тут ужо працавала шэсць ШСМ, якія наведвала 440 навучэнцаў. За гэты час беларускіх камплектаў у пачатковых школах павялічылася з 21 да 85, у якіх на сваёй нацыянальнай мове ўзгадоўвалася, 3,5 тысячы дзяцей.

З усіх раёнаў Заходнесібірскага краю найлепшай пастаноўкай працы па задавальненні нацыянальна-культурных запатрабаванняў беларусаў вызначаўся Вялікарэчанскі, у якім у 30-х гадах нават выходзіла на беларускай мове газета "Шляхам Ільіча".

Але мелася нямала раёнаў Сібіры, дзе пастанову ЦВК СССР ад 9 снежня 1929 года проста праігнаравалі, нічога канкрэтнага не зрабілі па арганізацыі жыцця беларусаў паводле іх нацыянальна-культурных традыцый. У апраўданне сваёй вялікадзяржаўнай палітыкі кіраўнікі такіх раёнаў, уключаючы і тых, хто ўзначальваў аддзелы народнай адукацыі, заяўлялі, што нацыянальна-культурнае адраджэнне сібірскіх беларусаў ажыццяўляецца супроць волі апошніх, носіць штучны характар. "Вялікарускія шавіністы, -- пісаў І.Скачкоў, -- якія заселі ў апаратах АНА, любяць казыраць фразай, што "само беларускае насельніцтва не жадае навучаць сваіх дзяцей на беларускай мове". З гэтым аўтар публікацыі не пагаджаецца, пішучы: "Несумненна адсталыя настроі маюцца і сярод беларускага насельніцтва... але сказаць, што ўсё беларускае насельніцтва супроць беларускай мовы, -- гэта не правільна... маем факты, калі само насельніцтва выносіць пастановы аб арганізацыі беларускай школы альбо аб пераводзе беларускіх школ (г. зн. школ, дзе вучыліся незалежна ад мовы навучання беларускія дзеці. -- **Л.Л.**) на родную мову. Але гэтыя пастановы ў жыццё не праводзяцца". У якасці прыкладу І.Скачкоў пр[illegible]ў Балоцінскі раён.

Вял[illegible] шкоду беларускай справ[illegible]аносіла тое, што шавіністычных поглядаў на яе не пераадолелі нават многія кіраўнікі самога Заходнесібірскага краявога аддзела народ[illegible] адукацыі. Дырэктывамі Н[illegible]СФСР перад імі была пастаўлена задача давесці ў 1931 годзе карэнізацыю нацыянальных школ пачатковага навучання да 70 працэнтаў. У дачыненні да некаторых нацменшасцяў такога працэнту строга прытрымліваліся мясцовыя органы, а вось для нашых суродзічаў беларусізацыю нацыянальных школ на кастрычнік 1931 года яны вызначылі толькі ў межах 31 працэнта. Меліся факты, калі накіраваных у Сібір беларускіх настаўнікаў пасылалі ў рускія школы, тлумачачы гэта ім тым, што адсутнічаюць беларускія школы. Такое і сапраўды магло быць, бо беларускіх дзяцей у значнай колькасці навучалі ў рускіх школах, замест таго каб у падобных выпадках ствараць ім нацыянальныя школы. З вялікім спазненнем (толькі на 1931 год) Заходнесібірскі крайАНА запраектаваў арганізацыю дзвюх беларускіх групаў пры педтэхнікумах і прычым усяго толькі на 85 навучэнцаў. Было сарвана адкрыццё беларускага аддзялення пры Томскім педагагічным тэхнікуме. Тут нельга не пагадзіцца з слушнай высновай І.Скачкова, што "пытанні беларусізацыі і падрыхтоўкі кадраў з беларусаў у значнай ступені тармозяцца адсутнасцю беларускіх школ павышанага тыпу ў РСФСР". Адмоўна ўплывала на ход беларусізацыі школ у месцах кампактнага пражывання нашых супляменнікаў амаль поўная адсутнасць у АНА Сібіры, як і ў іншых рэгіёнах РСФСР, інспектуры, якая была б добра знаёмая з моўнымі, бытавымі і іншымі асаблівасцямі мясцовых беларусаў.

Адзначаныя вышэй недахопы з беларусізацыяй сістэмы адукацыі былі характэрныя і для іншых сфераў жыцця нашых суродзічаў у Расійскай Федэрацыі. Паколькі на той час тут пражывала каля 500 тысяч беларусаў, культурна-асветніцкая праца з імі магла б мець непараўнальна больш шырокі, чым на самай справе, размах. Гэта прызнаваў і І.Скачкоў у артыкуле "Белоруссия -- аванпост культурной революции" ("Просвещение национальностей", 1932. N 5--6), пішучы, што "ў шэрагу краёў і абласцей мы маем, нягледзячы на неаднаразовыя дырэктыўныя ўказанні ўрада і Наркамасветы РСФСР, пэўнае адставанне ў частцы культабслугоўвання беларускага насельніцтва на роднай мове".

На вялікі жаль, ніхто: ні дзяржаўныя і партыйныя органы Расіі, ні Беларусі -- своечасова і сур'ёзна не паклапаціліся, каб беларусы, незалежна ад таго, жывуць яны ў межах РСФСР на сваіх этнічных тэрыторыях ці дзесьці ў далёкай і халоднай Сібіры, адчувалі сябе беларусамі. Таму меў рацыю І.Скачкоў, калі прапаноўваў і самой Беларусі выкарыстаць свой вопыт "для больш шырокага разгортвання культурнага будаўніцтва сярод беларусаў у РСФСР", арганізаваць культшэфства БССР над беларусамі Заходнесібірскага краю, дзе іх тады жыло каля 300 тысяч, Казахстана, Далёкаўсходняга краю, што "забяспечыла б больш хуткае прасоўванне карэнізацыі беларускіх нацыянальна-культурных устаноў і ў іншых краях РСФСР". Але не будзем забывацца, што пісаліся гэтыя радкі ў 1932 годзе, калі ў БССР прайшла першая хваля барацьбы з "нацдэмамі", калі пачала пакрысе зніжаць тэмпы беларусізацыя. Таму зварот І.Скачкова да сумлення партыйных і дзяржаўных органаў БССР дапамагчы пэўным рэгіёнам Расійскай Федэрацыі ў правядзенні беларусізацыі засталіся марным лямантам у пустыні.

З усёй упэўненасцю можна сцвярджаць, што пачатак 30-х гадоў для многіх раёнаў Расійскай Федэрацыі, дзе жылі беларусы, стаў канцом беларусізацыі. Гэтага не баяўся прызнаць і друкаваны орган ЦК саюза работнікаў асветы СССР "Просвещение национальностей". Аўтар артыкула "Борьба за качество -- центральная задача" (1931, N 10) Г.Гасілаў, закранаючы праблему нацыянальнай палітыкі ў галіне асветы, пісаў: "Асабліва моцныя тэндэнцыі вялікарускага шавінізму даводзіцца назіраць у асветніцкай працы сярод украінцаў і беларусаў... ён сваімі каранямі ідзе ў русіфікатарскую палітыку царызму". У артыкуле прыводзіцца такое месца са справаздачы Заходнесібірскага крайсаўнаркомасветы (чэрвень 1931 года): "Асабліва дрэнна ідзе справаа карэнізацыі ўкраінскіх і беларускіх школ. У Крышэнскім раёне ў 1929/30 г. працавла 8 беларускіх школ, а сёлета -- толькі адна. Ва Убінскім раёне 45 працэнтаў беларускага насельніцтва, а школы беларускай няма ніводнай". Недарэчна, што падобнае мела месца нават і на Смаленшчыне. Так, настаўнікі-шавіністы беларускай Любавіцкай ШКМ Руднянскага раёна адкрыта здзекаваліся з беларускай мовы, называючы яе варварскай.

Як часта здаралася з нашым народам, ён і на гэты раз вельмі моцна спазніўся са сваім нацыянальна-культурным Адраджэннем як у сябе дома, так і на тэрыторыях па-за межамі БССР. Кволыя парасткі беларусізацыі на Смаленшчыне, Браншчыне і Пскоўшчыне, у Заходнесібірскім і Далёкаўсходнім краях, Казахстане не пайшлі ў рост. Асноўны масіў тамтэйшых беларусаў стаў жыватворчым этнічным матэрыялам для колькаснага росту пераважна рускай нацыі.

Прагрэсіўная ва ўсіх адносінах ідэя беларусізацыі не ўпісвалася ў рамкі той палітыкі, якую пачала праводзіць сталінская таталітарная сістэма. Шмат з таго, што было намечана ў самой Беларусі і па-за яе межамі ў галіне нацыянальнай культуры і мовы, засталося нерэалізаваным. Па віне працўнікаў беларускга Адраджэння беларусізацыя не забяспечыла нашаму народу сапраўднага нацыянальнага росквіту.

Леанід ЛЫЧ,
доктар гістарычных навук, прафесар.

ІНТЭРВ'Ю ПАСЛЯ ЮБІЛЕЮ

МАЙСТАР ПАВІНЕН СЯДЗЕЦЬ НА ПЕРШЫМ РАДЗЕ

НА ПЫТАННІ КАРЭСПАНДЭНТА "ГОЛАСУ РАДЗІМЫ" АДКАЗВАЕ Лілія ДАВІДОВІЧ

-- Купалаўскі тэатр адсвяткаваў юбілей. Лілія Міхайлаўна, якія ўражанні засталіся, якія думкі ён нарадзіў?

-- Юбілей прайшоў выдатна. Свята было такім, якім і мае быць свята. Рамонт нават у тэатры зрабілі. І яшчэ, мабыць, адчуванне свята ўзмацнялася тым, што напярэдадні яго прайшоў "Фестываль сяброў". Да нас прыязджалі тэатры Літвы, Украіны, Польшчы. З вялікім поспехам прайшлі нашы гастролі ў Вільнюсе і Маскве, дзе мы паказвалі "Ідылію".

Што ж тычыцца самога тэатра, нашага паўсядзённага жыцця, думаю, што гэты сезон быў не з лепшых, таму што за цэлы год было пастаўлена толькі два спектаклі. У адным заняты я і Гарбук, другі -- своеасаблівы калаж па Крапіўніцкаму. Ва ўсякім разе фантастычнага юбілейнага спектакля ў тэатры не было. І ад гэтага сумна.

-- Нацыянальны тэатр у юбілейны год без нацыянальнай п'есы... Што здарылася з нашым мастацтвам!

-- Я не магу расшыфраваць гэту з'яву. З аднаго боку, як і ва ўсіх, грошай нестае. З другога, няма такой беларускай п'есы, за якую сёння можна было б ухапіцца і ставіць. У нас такі вопытны загадчык літаратурнай часткай -- Мікалай Матукоўскі, што каб з'явіўся нейкі вартасны драматургічны твор, ён абавязкова звярнуў бы на яго ўвагу.

-- А "Купалу" Дударава тэатр не спрабаваў паставіць, ці да п'есы таксама былі вялікія прэтэнзіі?

-- Многія тэатры яе паставілі. І мы таксама нават рэпеціравалі "Купалу", але, як вы гаворыце, вялікія прэтэнзіі былі да п'есы і ў акцёраў, і ў рэжысёра, і таму адмовіліся ад яе. Здаецца мне, што гэта не лепшая п'еса Аляксея Дударава. Мусіць, усе мы зараз перажываем такі час, калі не надта хочацца пісаць, не надта хочацца гаварыць.

-- Тады давайце, Лілія Міхайлаўна, вернемся ў мінулае. Каго з пачынальнікаў Купалаўскага тэатра вы яшчэ заспелі, калі прыйшлі сюды працаваць, каго і сёння можаце ўспомніць цёплым словам!

-- Я прыйшла ў тэатр, калі ён быў у сваім росквіце. У ім былі Ржэцкая, Глебаў, Рахленка, Малчанаў. Аляксеева і Браварская былі зусім маладзенькімі і ігралі ўвесь рэпертуар. Я прыйшла на тры гады пазней за Машу Захарэвіч, Аўсяннікава, Тарасава, але былі акцёры і маладзейшыя за мяне, і таму я не адчувала сябе беднай сіроткай. Такой я сябе не адчувала яшчэ і таму, што вельмі цёпла, ласкава, пяшчотна сустрэлі мяне Лідзія Іванаўна Ржэцкая, Глебушка. І нават калі на адным мастацкім савеце размяркоўвалі тры п'есы і я нідзе ніводнай ролі не атрымала і выскачыла ў калідор захлынаючыся слязьмі, Глебушка столькі са мной размаўляў, столькі мяне супакойваў. Мне той падваконнік, на якім мы сядзелі і доўга размаўлялі, запомніўся на ўсё жыццё. Акцёрскае жыццё, ён гэта добра ведаў, складаецца не з адных прыемнасцяў. А мне ж тады здавалася, што калі я прыйшла ў тэатр, то адразу павінна браць быка за рогі. І Лідзію Іванаўну не дарма ў тэатры называлі мамай Лідай. Пры знешняй суровасці яна была далікатны, цудоўны чалавек. І цяпер я захоўваю нейкія падарункі, сувеніры, што яна дарыла на прэм'еру, на 8 Сакавіка. І святы ў тэатры ў нас былі дамашнія. На іх панавала цёплая атмасфера. Не было разрыву паміж маладымі і старымі, хаця была павага да старэйшых. Мне, напрыклад, ніколі ў галаву не магло прыйсці спытаць, чаму я атрымліваю меншую зарплату, чым Лідзія Іванаўна. У аўтобусе, калі ехалі выступаць, ніколі ніхто з абслугі не садзіўся на першыя месцы[illegible] іх павінны сядзець вядучыя акцёры[illegible]а. Сёння ўсё гэта зняважана, не ма[illegible]якага значэння. Хаця, я лічу, яго вялікасць тэатр павінен вызначыць, дзе кароль, а дзе слуга. Творчая атмасфера ў тэатры сёння нейкая іншая. Мне н[illegible]разумела сітуацыя, калі адбываец[illegible]эм'ера, а ў зале амаль нікога няма [illegible] калектыву. Абыякавасць, незацікаўленасць. Нонсенс!



-- А як вы сёння ўспрымаеце гледача? Раней у тэатр хадзілі як у храм, як на свята. Глядач таксама сёння стаў іншым!

-- На прэм'еру ідзе публіка, каб нечаму здзіўляцца, засмучацца, радавацца. Так бывае спектакляў дзесяць. Потым залу запаўняюць у асноўным "пэтэушнікі" (навучэнцы прафесійна-тэхнічных вучылішчаў. -- **Д.Ч.**), вучні старшых класаў, якіх прыводзяць амаль прымусова. А калі яны збіраюцца разам, у іх абуджаюцца нейкія статкавыя інстынкты. Яны качаюць па падлозе бутэлькі, гарпапаняць...

-- Мусіць, пасля гэтага вам сагрэлі душу гастролі, якія толькі што прайшлі ў Вільнюсе і Маскве!

-- Не тое слова -- "сагрэлі"! Гэта быў фантастычны поспех. Раскошная зала Нацыянальнага тэатра ў Вільнюсе апладзіравала нам стоячы. І такі ж поспех быў у Маскве. Я не бяруся даваць ацэнкі, але, па многіх водгуках, наша "Ідылія" была лепшым спектаклем "Фестывалю сяброў". Ён і сапраўды вельмі добры. Я занята ў гэтым спектаклі, і кожны раз атрымліваю асалоду. І таксама адчуваюць сябе маладыя артысты ў масоўках. Ёсць спаянасць усяго калектыву.

І гэта заслуга нашага рэжысёра Колі Пінігіна. Я прызнаюся, што калі прачытала "Ідылію" Дуніна-Марцінкевіча, схапілася за галаву: што там можна прыдумаць, якая гэта п'еса? А Пінігін здолеў убачыць, прыдумаць такі цудоўны спектакль на гэтым матэрыяле.

На вялікі жаль, таленавіты рэжысёр цэлы год нічога ў нас у тэатры не ставіць. Пінігін у росквіце сіл, у ім кіпіць энергія, а ён не запатрабаваны. Дарэчы, не запатрабаваны толькі дома. Бо яго запрашаюць ставіць спектаклі ў Маскву, у Панявежыс, яшчэ некуды. Мы я[illegible]ожам страціць, і гэта будзе незаме[illegible] страта.

-- Стала нейкім заганным правілам, што беларусы так і не навучыліся цаніць і шанаваць свае тал[illegible], беражліва ставіцца да іх. На ю[illegible]йным вечары, калі купалаўцаў віншавалі калегі з лялечнага тэатра, яны жартам пыталі: "А чаго ж, чаго захацелася ім!" (купалаўцам. -- Д.Ч.). І адказвалі, як у славутым вершы: "Людзьмі звацца!" Мне падалося, што яны ў той час мелі на ўвазе не толькі юбіляраў, але і сябе, і калег з іншых устаноў культуры.

-- Натуральна, натуральна! Падумайце самі, як мы можам існаваць, атрымліваючы 450 тысяч рублёў у месяц! Калі я прыйшла ў тэатр, я мела зарплату 65 рублёў, але з іх я плаціла за кватэру, нармальна апраналася, нармальна выглядала і не млела ад голаду.

Столькі часу мінула. Здавалася, нечага дасягнула, нешта ўмею. Рана стала заслужанай артысткай -- праз шэсць гадоў як прыйшла ў тэатр, сыграўшы ролю Ганны ў "Людзях на балоце" Мележа. І зараз я сярод сямі вядучых артыстаў тэатра. Майстар сцэны, як нас называюць. І што я маю? Не намнога больш за пачынаючую артыстку. Калі сёння на базары бачу людзей, што ўзялі жыццё ў свае рукі, раз'язджаюць на "Мерседэсах" і "BMW", на душы робіцца горка.

-- Выступаючы на юбілейным вечары, наш Прэзідэнт паабяцаў, што хутка зверне ўвагу і на інтэлігенцыю, акажа ёй дапамогу. Верыце ў гэта!

-- Слаба веру. Але хачу сказаць, што з задавальненнем слухала, калі Прэзідэнт выступаў на беларускай мове. Якое смачнае, натуральнае ў яго вымаўленне! А на банкеце -- зноў па-руску.

-- Ну, калі мы ўжо закранулі мову... Купалаўскі тэатр заўсёды быў і застаецца беларускамоўным, але ў яго ніколі менавіта па гэтай прычыне не было праблем з гледачамі. І ў Мінску, і на выездзе ніхто не скардзіўся, што не разумее мовы, на якой ідзе спектакль...

-- У Маскве на апошніх гастролях першы спектакль быў з перакладам і прайшоў горш, таму што пераклад перашкаджаў людзям, замаруджвалася рэакцыя. І ў Вільнюсе нас разумелі без перакладу. Было б што глядзець. "Паўлінку" заўсёды і ўсюды прымалі і прымаюць з захапленнем.

-- І ўсё ж "Паўлінку" пераклалі на рускую мову і паказвалі па тэлебачанні з Масквы. Каму гэта было патрэбна!

-- А я вам скажу, як гэта атрымалася. Я была партыйным сакратаром у тэатры, і аднойчы мне даручылі рабіць справаздачу на сакратарыяце ЦК КПСС аб рабоце партыйнай арганізацыі тэатра імя Янкі Купалы. Гавораць, што за 70 гадоў савецкай улады гэта быў першы такі выпадак. А чаму менавіта наш тэатр, не ведаю, ніхто з членаў ЦК ніколі наш тэатр у вочы не бачыў. І тады нехта, здаецца Гарбачоў, пытаецца, ці паказваюць спектаклі нашага тэатра па тэлебачанні. Я адказваю, што, канешне, толькі па мясцоваму, а па ўсесаюзнаму ніколі. І тады Чарненка, які вёў сакратарыят, ускінуўся: "Як гэта "ніколі"? Усялякую лухту паказваеце, а такі тэатр (на самай справе ён і паняцця не меў, які тэатр) не паказваеце". "Будзем, будзем паказваць!" -- адказалі яму. Тады і была перакладзена на рускую мову "Паўлінка", ад чаго, канешне ж, страціла сваё зачараванне.

-- Лілія Міхайлаўна, вы гаворыце, што тэатр зараз перажывае не самы лепшы час. А ці верыце вы ў новыя п'есы, у добрыя перамены, у лепшыя часы для тэатра!

-- Веру, канешне. І драматургі беларускія ёсць, пачынаючы ад Дуніна-Марцінкевіча і канчаючы нашымі сучаснікамі. Самае галоўнае -- знайсці рашэнне, прыдумаць спектакль. Для гэтага важна не згубіць добрых рэжысёраў, зацікавіць, даць працу маладым акцёрам. Сёлета ў тэатры папаўненне. З Акадэміі мастацтваў прыйшлі чатыры хлопцы і чатыры дзяўчыны. Здольныя, прыгожыя, поўныя жадання тварыць. Будучыня, канешне ж, за маладымі. Яны ўсё бачаць па-іншаму, нават наш сённяшні час.

Гутарыла
Дзіяна ЧАРКАСАВА.

НА ЗДЫМКУ: Лілія ДАВІДОВІЧ віншуе з залатым юбілеем калектыў Брэсцкага тэатра драмы і музыкі.

Фота Эдуарда КАБЯКА.



←
У Белдзяржфілармоніі адбыўся творчы вечар вядомага беларускага паэта Ніла Гілевіча "Песню бярыце з сабой". У ім прынялі ўдзел лепшыя музычныя калектывы Беларусі.

→
Заснавальнік міжнароднага цэнтра "Музыка надзеі" аргенцінскі музыкант Мігель Анхель ЭСТРЭЛА выступіў з сольным канцэртам перад дзецьмі ў рэабілітацыйным цэнтры ў Аксакаўшчыне.







АДЛЮСТРАВАНА НА СТАГОДДЗІ

Вялікая сіла фатаграфіі як дакумента. Яна становіцца яшчэ больш значнай, калі здымак, зроблены многа год назад, дазваляе азірнуцца ў мінулае, робячы нас сведкамі даўніх падзей, дазваляючы параўноўваць, знаёміцца з эпохай, здзіўляцца.

Сярод тых, хто пакінуў неацэнную фатаграфічную спадчыну, былі людзі рознага грамадскага стану -- ад універсітэцкіх вучоных да простых сельскіх фатографаў. Адзін з іх -- Юзаф Шыманчык. Нарадзіўся ён у 1909 годзе ў мястэчку Косава на Брэстчыне. Самастойна асвоіўшы фатаграфічнае майстэрства, ужо з васемнаццаці гадоў пачаў працаваць прафесіянальна. Зарабляючы фатаграфіяй на жыццё, Юзаф многа здымаў для сябе, ствараючы своеасаблівы фатаграфічны летапіс беларускага Палесся. Большасць яго работ адзнята ў наваколлях азёр Белае і Спораўскае, у самім Косаве і ў вёсцы Пяскі (цяпер гэта Бярозаўскі раён). На здымках Юзафа Шыманчыка вобразы с..., рабочых, сцэны быту ...скіх жыхароў, іх цяжкая праца.

Багаты фатаграфічны архіў Юзафа ледзь было не загінуў у час вайны, калі фашысты, адст...чы, спалілі яго дом. Зг...а ўсё, акрамя негатываў, схаваных у падвале.

Пасля вайны Шыманчык паехаў жыць у Польшчу, дзе яшчэ сорак гадоў працаваў фатографам у гарадку Кутна. З выхадам на пенсію, у 1985 годзе, ён пераехаў у Лодзь, дзе і па сёння жыве, маючы за плячамі 85 год.

Усё, што адлюстраваў на плёнцы Юзаф Шыманчык, па вартасці ацэнена спецыялістамі-этнографамі, гісторыкамі. Яго фатаграфіі набылі музеі і бібліятэкі Варшавы, Кракава, Беластока, Мінска, Бярозы. Яго работы выклікаюць жывую цікавасць ва ўсіх, хто неабыякавы да гісторыі Беларусі.

Яўген КАЗЮЛЯ.

НА ЗДЫМКАХ: Юзаф ШЫМАНЧЫК і яго фатаграфіі палешукоў.





ВЕЧАРЫНА, ПРЫСВЕЧАНАЯ ЯНУ СКРЫГАНУ

ГАРЭЛІ СВЕЧКІ, ПАТРЭСКВАЎ КАМІН...

Ён не дажыў да свайго дзевяностагоддзя. Выдатнага дзеяча культуры, пісьменніка і перакладчыка Яна Скрыгана не стала ў тысяча дзевяцьсот дзевяноста другім.

А 16 лістапада Саюз беларускіх пісьменнікаў наладзіў вечар, прысвечаны 90-м угодкам гэтага выдатнага майстра слова. Ва ўтульнай кавярні Дома літаратара сабраліся сябры, аднадумцы, сваякі -- людзі, пра якіх Ян Скрыган напісаў: "Мне здаецца, што і пасля смерці я буду памятаць і буду шчаслівы, што нехта на зямлі вельмі любіў мяне".

Гарэлі свечкі, патрэскваў камін. З партрэта з прыхаванай усмешкай пазіраў на нас дзядзька Янка. (Так называюць яго маладзейшыя). Пад партрэтам — гады жыцця: 1905--1992. "Мая біяграфія, -- пісаў Ян Скрыган, -- здаецца мне вельмі доўгай, і я дзіўлюся, як многа ў ёй змешчана. Я зазнаў і трагізм, і роспач, зведаў цану радасці і надзей..."

Першымі гаварылі старэйшыя пісьменнікі Янка Брыль і Сяргей Грахоўскі. Сяргей Іванавіч адгарнуў трагічную старонку жыцця свайго лепшага сябра. Яго аповяд пра тыя пакуты, якія зведала беларуская інтэлігенцыя, у тым ліку і наш юбіляр, у 1936 годзе, болем адгукаўся ў сэрцы кожнага. Янка ...ыган спазнаў жахі арыштаў, ...раў, ссылак. На працягу амаль дваццаці гадоў быў адлучаны ад сваёй бацькаўшчыны. "У 1936--1955 жыў за межамі Беларусі (Сібір, Узбекістан, Эс...ія)", -- сведчыць "Энцыкла...ыя літаратуры і мастацтва ...ларусі".

Дзякуй Богу, гэтыя пакуты не зламалі Янку. У 1955 годзе ён быў рэабілітаваны і, вярнуўшыся на радзіму, да апошніх дзён свайго жыцця шчыраваў на ніве беларускай культуры. Клопат аб роднай мове быў для яго, бадай, галоўным. Падчас працы ў БелСЭ Ян Скрыган адшукаў, стварыў, вярнуў у нашую літаратуру дзесяткі слоў і тэрмінаў, якія натуральна прыжыліся ў друку, узбагацілі нашу мову. Як часта мы гаворым "смаката", "любата", "лецішча" -- і не ведаем, што гэтыя каларытныя словы ўвайшлі ў нашае жыццё дзякуючы Яну Скрыгану.

Ён быў патрабавальным да сябе і да іншых, жорстка крытыкаваў мову нашых пісьменнікаў як маладых, так і сталых, прызнаных. Беспрэцэдэнтны, на мой погляд, выпадак, пра які згадаў у сваім выступленні Ніл Гілевіч, адбыўся падчас працы Яна Скрыгана ў часопісе "Полымя". Ён рэдагаваў раман Міхася Лынькова "Векапомныя дні" і ў выніку -- скараціў эпапею на цэлы том! З жывых класікаў выціскаў лішняе, і яны былі ўдзячныя за гэта.

Як пісьменнік Ян Скрыган працаваў няспешна і вучыў гэтаму маладзейшых. Ягонае майстэрства заключалася ў тым, што ён пісаў вельмі проста, адной дэталькай умеў перадаць сутнасць чалавека.

Ян Скрыган належыць да тых творцаў, кнігі якіх чытаюць і перачытваюць па некалькі разоў. Чаму так адбываецца? Вось як на гэтае пытанне адказвае сам пісьменнік: "Вечар. Цішыня. Кнігі за шклом на паліцах. Што пачытаць? Адны даўно перачытаныя, другія -- нават не пачатыя. Дзіва: і чытаць іх не хочацца. Спрабую каторы раз -- не ідуць яны. Нікуды цябе не завуць.

І тады зноў бяруся за тыя самыя, па многа разоў чытаныя, перачытаныя, колькі разоў краtаныя, вароchаныя -- і зноў чуеш у іх нешта вечна патрэбнае тваёй душы.

Мабыць, таму, што пісаліся яны даверліва, як споведзь перад табою. Як жа мала трэба мець вялікаму пісьменніку, каб да яго ўсе гарнуліся -- толькі самога сябе. І як многа -- каб у ім кожны бачыў таксама самога сябе".

Літаратурная спадчына Яна Скрыгана параўнальна невялікая. Але ніводнага лішняга слова ў ягоных творах не знойдзецца.

... Гэты вечар доўжыўся каля дзвюх гадзін. Чыталіся нарысы і замалёўкі Яна Скрыгана, унук Яська выконваў на гітары класічныя творы, гучалі любімыя песні дзядзькі Янкі. Акрамя названых, пра юбіляра, гэтага чараўніка роднага слова, чалавека, які выпраменьваў святло, цёпла гаварылі Уладзімір Паўлаў, Генадзь Шупенька, Хрысціна Лялько, Мікола Татур, Янка Саламевіч, Васіль Вільтоўскі, а таксама жонка Ганна Міхайлаўна і дачка Галіна.

НАМ ПІШУЦЬ


Атрымала газету "Голас Радзімы", і там нарыс пра маці "Я ад вас далёка". Вось дзе была радасць і слёзы. Нізкі паклон ад усіх Лёсікаў. Напісана вельмі добра і ад душы. Цяпер яшчэ больш даражу гэтай газетай.

Алеся ЛЁСІК.

Стаўрапольскі край,
г. Татарка.

Рэдактар Вацлаў МАЦКЕВІЧ

ЗАСНАВАЛЬНІК:
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом (таварыства "Радзіма").



НАШ АДРАС:
220005, МІНСК, ПРАСПЕКТ Ф. СКАРЫНЫ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Пазіцыя рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", не заўсёды супадаюць.

Газета набрана і звярстана ў камп'ютэрным цэнтры рэдакцыі газеты "Вечерний Минск". Аддрукавана ў друкарні "Беларускі Дом друку". (220041, г. Мінск, пр. Скарыны,77).
Тыраж 6 000 экз. Індэкс 63854. Зак.5983.
Падпісана да друку 27.11.1995 г.